

„Ніве" 50 гадоў ☞9

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 43 (2632) Год LI Беласток, 22 кастрычніка 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

*Алесь Бяляцкі: — Я „Ніву" любіў, люблю і буду любіць, бо яна з'яўляецца ўзорам нармальнай беларускай газеты, якая піша пра нармальных беларускіх людзей...*

# Урачысты юбілей „Нівы"

У пятніцу і суботу 13 і 14 кастрычніка ў беластоцкім гатэлі „Галэмбеўскі" адбыліся Беларускія дні „Нівы" — мерапрыемствы, прысвечаныя 50-годдзю нашага тыднёвіка. У згаданыя два дні праходзіла папулярна-навуковая канферэнцыя, а ў апошні дзень адбылася ўрачыстая вечарына.

У канферэнцыі ўдзел прынялі віднейшыя лідэры беларускага нацыянальнага жыцця, між іншым: Івонка Сурвіла з Канады — старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, Вячка Станкевіч са ЗША — сябра Рады БНР, Лёля Міхалюк — старшыня Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі, Алесь Бяляцкі — лідэр Праваабарончага цэнтра „Вясна", Вінцук Вячорка — лідэр Беларускага народнага фронту, Тацяна Казак — лідэр Згуртавання беларусаў Латвіі, Хведар Нюнька — лідэр літоўскіх беларусаў, Алена Макоўская — старшыня Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына". Акрамя іх былі яшчэ вучоныя-беларусісты, грамадскія дзеячы, літаратары, журналісты. На кароткі час завіталі на канферэнцыю лідэр беларускай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч з жонкай.

Даклады, прысвечаныя ўсебаковаму асвятленню ролі „Нівы", асабліва на Беласточчыне і Беларусі, зачыталі: Алег Латышонак, Сакрат Яновіч, Сяргей Чыгрын, Барыс Сачанка, Вячка Станкевіч, Алесь Бяляцкі, Ніна Баршчэўская, Ян Чыквін, Ганна Кандрацюк, Славамір Іванюк, Юрка Туронак, Вінцук Вячорка, Яўген Міpановіч, Марцін Рэмбач, Паліна Сцепаненка, Алена Макоўская, Віталь Луба і Яўген Вапа. Мультымедыйную прэзентацыю маладых беларускіх мастакоў Беласточчыны паказала Ілона Карпюк.

У суботу пасля абеду адбылася ўрачыстая акадэмія, спалучаная з мастацкай часткай. Прысутнічалі на ёй асобы, звязаныя з ніўскім асяроддзем, м.інш. настаўнікі, дзеячы беларускай культуры, журналісты і карэспандэнты тыднёвіка. Ганаровымі гасцямі акадэміі былі м.інш. віцэ-маршалак Сената Рэчы Паспалітай Кшыштаф Путра, дэпутатка Еўрапарламента Барбара Кудрыцкая, дэпутаты Сейма РП Роберт Тышкевіч і Роман Чэпэ, прадстаўніца Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі РП Івона Гродзкая, старшыня Рады БНР Івонка Сурвіла, консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Вадзім Палякоў.

Вёў акадэмію журналіст Беластоцкага радыё Юрка Ляшчынскі. Даклад пра пяцьдзесят гадоў „Нівы" зачытаў галоўны рэдактар тыднёвіка Яўген Вапа. Затым удзельнікі акадэміі хвілінай маўчання ўшанавалі памяць адышоўшых на вечны спачын звязаных з „Нівай" людзей. Пасля на сцэне выступіў вакальны калектыў „Знічка" з Гайнаўскага белліцэя.



фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

*Прафесар Яўген Міpановіч і Івонка Сурвіла з Канады — старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі*

Віцэ-маршалак нашага Сената Кшыштаф Путра падкрэсліў, што разнароднае Падляшша з'яўляецца вялікім скарбам Рэчы Паспалітай. Усё вучымся — усе, большасць і меншасці — функцыянаваць у новай рэчаіснасці. Хочам, каб „Ніва" мела магчымасць уздзейнічаць на тое, што дзеецца за нашымі межамі, у Беларусі, каб там хутчэй будзілася дэмакратыя.

Благачынны Сакольскага дэканата айцец Уладзімір Місяюк зачытаў віншавальны ліст ад епіскапа беластоцка-гданьскага Іакава.

Старшыня Рады БНР Івонка Сурвіла падкрэсліла разуменне ролі культуры ў жыцці нацыі. Парадоксам з'яўляецца, што народ гэтага не разумее, што культура і мова з'яўляюцца варункамі яго існавання, а звонку народ паважаюць за яго ўклад у культурную скарбніцу чалавецтва. Падкрэсліла, што беларуская меншасць у Польшчы адыгрывае вялікую ролю ў захаванні беларускай культуры.

З чарговымі віншаваннямі выйшлі на трыбуну Алена Макоўская і Ніна Шыдлоўская са ЗБС „Бацькаўшчына". Вінцук Вячорка, старшыня БНФ, адзначыў, што Беларусь павінна быць дзяржавай надзейнай і стабільнай, быць агмянём свабоды і беларушчыны. Далей віншаваў „Ніву" Барыс Сачанка, віцэ-старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Вадзім Палякоў зачытаў віншавальны ліст ад пасла РБ у Польшчы Паўла Латушкі.

Вучні беластоцкіх Пачатковай школы н-р 4 і Гімназіі н-р 7 паказалі спектакль „Цацачная крама", нарыхтаваны пад кіраўніцтвам настаўніцы Аліны Ваўранюк. Алесь Бяляцкі з Праваабарончага цэнтра „Вясна" заявіў:

— Я „Ніву" любіў, люблю і буду любіць, бо яна з'яўляецца ўзорам нармальнай беларускай газеты, якая піша пра нармальных беларускіх людзей.

З далейшымі віншаваннямі выступілі Вольга Сянкевіч і Іаланта Грыгарук з Гайнаўскага белліцэя, Юрка Хмялеўскі з „Часопіса", Андрэй Сцепанюк, Пётр Божка і Валянціна Бабулевіч з Бельска-Падляшскага, Марцін Рэмбач з Цэнтра „Польшча-Беларусь", Мікола Бушко з Фонду царкоўнай музыкі, Віктар Стахвюк з Радыё „Рацыя", настаўніца з Гайнаўшчыны, Сяргей Чыгрын са Слоніма і Уладзімір Лапцэвіч з Масквы.

Журналісты і карэспандэнты нашага тыднёвіка атрымалі сувеніры, затым нашы рэдакцыйныя сяброўкі Ганна Кандрацюк і Ілона Карпюк з сябрамі праспявалі некалькі песень. Акадэмію завяршыла выступленне мінскага ансамбля даўняй беларускай музыкі „Тэстамент". Цэлае мерапрыемства закончыла супольная вячэра ў рэстаране „Гродна" пад музыку ў выкананні ансамбля Генадзя Шэмета.

**Аляксандр ВЯРБІЦКІ**

## „Прастрэленая" праўда ☞2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тыдзень таму здарылася страшная трагедыя. У Маскве забілі журналістку „Новой газеты" Ганну Паліткоўскую. Смерць такога чалавека, на мой погляд, раўназначная гібелі многіх дзесяткаў, а можа і соцень людзей. Я не быў, канешне, знаёмы з Паліткоўскай асабіста і нават не ведаў яе ў твар (такіх людзей расійскія тэлеканалы апошнія гады папросту не паказваюць)...

## Бура ў Гайнаўцы ☞4

Раіна СТЭФАНЧУК

У час сустрэчы сеймавай Камісіі па справах нацыянальных і этнічных меншасцей у Гайнаўцы было вельмі бурліва. Улады Галоўнага праўлення БГКТ не скрывалі свайго абурэння рашэннем аб адняцці ім на тры гады датацыі...



## 1923 - 2006

## Апошняе развітанне

*Памяці Кастуся Майсені*

*Жыццёвы лёс зусім не быў салодкі,*
*Ён быў цярністы, Дарагі Кастусь.*
*Супроць Цябе было шмат розных сродкаў,*
*Ты ўсё жыццё цярпеў за Беларусь.*

*Цяжкім было і доўгае ўміранне,*
*Выгляд шпітальных госпісных умоў.*
*Апошняе з Табою развітанне*
*Чуллівай Жонкі і Тваіх сяброў.*

*Ты ўсё жыццё сваё пражыў з надзеяй,*
*Што праца не растрацiцца Твая.*
*Дык помнік Твой, у постаці Музея,*
*Павінен быць Твайго, Кастусь імя.*

*Спі, спі спакойна, Дружа, з Божым Духам,*
*Пасля трудоў жыццёвых і трывог.*
*Хай хоць зямелька будзе Табе пухам,*
*Няхай Цябе ў апецы мае Бог!*

**Віктар ШВЕД**
**Гайнаўка, 14.X.2006 года.**

*Намесніку галоўнага рэдактара „Газеты Слонімскай", ніўскаму аўтару Сяргею Чыгрыну словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора — смерці Бацькі*

*— выказвае рэдакцыйны калектыў „Нівы".*



# „Прастрэленая" праўда

*Тыдзень таму здарылася страшная трагедыя. У Маскве забілі журналістку „Новой газеты" Ганну Паліткоўскую. Смерць такога чалавека, на мой погляд, раўназначная гібелі многіх дзесяткаў, а можа і соцень людзей. Я не быў, канешне, знаёмы з Паліткоўскай асабіста і нават не ведаў яе ў твар (такіх людзей расійскія тэлеканалы апошнія гады папросту не паказваюць), а толькі чытаў некалькі яе артыкулаў у Інтэрнэце. Але не пакідае мяне адчуванне страты блізкага чалавека. Гэтая жанчына ратавала гонар і сумленне не толькі расійскай, але і сусветнай журналістыкі. Яна была адной з нямногіх, хто пісаў праўду пра жахі расійска-чачэнскай вайны, пра забойствы нявінных людзей, пра зверствы вайскоўцаў-акупантаў і бандытаў-калабарантаў, пра карупцыю, пра тое, як нявінных прызначаюць „тэрарыстамі" і садзяць у засценкі, дзе яны маюць права толькі на катаванні і здзекі.*

*Паліткоўскую ўжо спрабавалі забіць, яе сістэматычна палохалі, а колькі год таму нават атруцілі, але не да смерці. Зараз чорную справу давяршылі. Не мае значэння адкуль быў зроблены „заказ" — з самога Крамля (што найверагодней!) ці з якой ніжэйшай уладнай структуры. Зразумела ўсім, што гэта чыста палітычнае забойства, якое пры цяперашнім маскоўскім рэжыме не будзе раскрытае. Так, як да гэтага часу не раскрытыя забойствы грамадска-палітычнай дзяячкі Галіны Старавойтавай і праваслаўнага святара-экуменіста Аляксандра Меня, вялікіх людзей, якія хацелі зрабіць сваю краіну хоць крыху лепшай і вальнейшай. Як не раскрытая праўда пра забойства іншага аўтара „Новай газеты" Юрыя Шчакаціхіна, якога атруцілі тры гады таму. Такой была і Паліткоўская, маці дваіх дзяцей, якая не пабаялася памерці за Праўду, якая па сутнасці зрабіла свой страшны выбар — загінуць і пакінуць дзяцей сіротамі. Гэтая кволая жанчына давала прыклад усім сваім калегам-аднадумцам, а таксама давала шанц усім тым „інтэлектуалам" ад журналістыкі, якія здрадзілі ідэалам маладосці, перайтварыліся ў тлустых мас-медыйных катоў, у прыстасаванцаў, якія ці супрацоўнічаюць з цемрашаламі-чэкістамі, ці найпрост прыслужваюць ім.*

*Калі забілі журналістку, кіраўніка расійскай дзяржавы прымалі ў Нямеччыне на самых вышэйшых роўнях. Каментуючы здарэнне, Пуцін, скрывіўшыся, „выразил сожаление", дадаўшы што дзейнасць Паліткоўскай не мела асаблівага ўплыву ў краіне. Гэта была чарговая хлусня і галоўным доказам ёсць само забойства журналісткі, слова якой уплывала на многіх. Расійскі фашызм развіваецца лагічна і паслядоўна. Забойства Паліткоўскай не першае і не апошняе забойства такога кшталту, яно толькі этап. Каб пераканацца ў гэтым дастаткова ўвайсці на неанацысцкія сайты, якія працуюць у пуцінскай дзяржаве абсалютна легальна. На гэтых сайтах размешчаны фотаздымкі і нават хатнія адрасы прыгавораных да смерці праваабаронцаў, журналістаў, дэмакратычных апазіцыйных палітыкаў, адкрытыя заклікі да забойстваў. У гэтым спісе прозвішчы людзей, якія адчайна спрабуюць ратаваць краіну ад нарастаючай дыктатуры зла. А лідэры „заходніх дэмакратычных краін" крывадушна могуць толькі выказаць „заклапочанасць сітуацыяй з правамі чалавека". За нафта- і газадолары яны гатовыя прадаваць усё — агульначалавечыя вартасці, сумленных людзей, нават цэлыя народы і краіны.*

*У журналістыцы таксама ёсць свае святыя. На фоне жоўтай і чарнасоценнай прэсы, якая сваёй брыдотай проста захлынула шматпакутны расійскі народ, Ганна Паліткоўская была сапраўднай апосталкай свабоднага і праўдзівага слова, боль іншых людзей не даваў ёй маўчаць, яна і стала менавіта такой Святой ад журналістыкі. Калі Расія будзе нармальнай краінай, імёны саноўных крамлёўскіх кіраўнікоў, шырокалампасных генералаў-дзгенератаў — цынічных і крывадушных забойцаў-нерончыкаў стануць сімвалам улады і часу бесаў. А іменем Ганны Паліткоўскай назавуць вуліцы гарадоў, напэўна які-небудзь гуманітарны універсітэт. Бо можна забіць чалавека, але праўду, як праяву Боскай ласкі, не ў стане забіць ніхто. Хоць і ёсць адчуванне, што яе прастрэлілі.*

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# І зноў парытэты



*Вельмі коратка ўдалося нам пажыць без парытэтаў ды раўнавагі сіл, якія цвёрда царствавалі ў нас у час існавання капіталістычнага і сацыялістычнага лагераў. Яны былі найважнейшымі элементамі тадышняй палітыкі. Адзін і другі бок пільна сачылі, каб не праспаць гэтай раўнавагі сіл і не дацца адурачыцца праціўнаму лагеру.*

*Потым аказалася, што нічога гэта не дало. Калі прыйшло на пагібель, то не памаглі ні парытэты, ні раўнавага сіл. Распаўся-разваліўся Савецкі Саюз і ўся савецкая сістэма. Распаўся сам па сабе, ад старасці, так бы мовіць. Як і прарочылі яму. Я гэтыя прароцтвы, што савецкая ўлада пратрымаецца ў Расіі 70 гадоў, чуў даўным-даўно. І, канешне, ніяк не верыў ім, але сталася.*

*Грамадствы сацыялістычнага лагера пачалі ізноў будаваць у сябе капіталізм. І трэба прызнаць, што для простага народа гэтая перабудова даецца з вялікімі цяжкасцямі, а вось для нашых былых камуністычных эліт зусім наадварот. Такімі парабіліся расовымі капіталістамі што о-го-го! Паглядзіце ў тэлевізары на іх сытыя твары і новенькія „мерседэсы". І чуюцца ў гэтай ролі цудоўна, бо гэта сапраўдныя ленінцы. Яны вельмі добра чуліся робячы „шаг вперёд" і яшчэ лепей чуюцца робячы „два назад"...*

*Пасля смерці нашага сацыялістычнага лагера перасталі гаварыць пра парытэты і раўнавагу сіл, бо і сэнсу не было. З Савецкага Саюза асталася Расіюшка, але яна чуць дыхала тады і мела мноства сваіх унутраных клопатаў. Кітай далёка і заслабы яшчэ быў. Ды і яны ж хуткімі тэмпамі пачалі будаваць у сябе капіталізм.*

*Непакорнымі асталіся Кастра і Лукашэнка. Кастра аднак ніколі не прадстаўляў сабой мілітарнай небяспекі, а ў Аляксандра Рыгоравіча забралі смертаносныя ракеты. Падобна ў сіласныя ямы, дзе стаялі яны, пачалі засыпаць слаўную беларускую бульбу. Значыць, і з гэтага боку пагрозы ніякай.*

*Вось і пачало здавацца, што калі ўсе нашы дзяржавы будуюць капіталізм, то нашы грамадствы сабяруць „гэть да купкі" і будуць памаленьку і ў згодзе „сосуществовать". Хутка аднак аказалася, што так могуць думаць толькі наіўныя. Злучаным Штатам Амерыкі, якія ўвесь час былі на пад'ёме і пратрывалі без убыткаў, стала сумным спакойнае „сосуществование" ўжо капіталістычных дзяржаў і народаў. І пачалі яны дзяліць народы і дзяржавы на лепшыя і на горшыя, патрэбныя і не зусім. І сурова караць тых горшых і непаслушных ім.*

*Спачатку развалілі Югаславію, цяпер развальваюць Ірак і Афганістан. На чарзе Паўночная Карэя, Іран і іншыя краіны. І не дзіва, што ў свеце зноў загаварылі аб парытэтах і раўнавазе сіл...*

*Найгоршае аднак ва ўсім гэтым тое, што нашыя дзяржаўныя мужы, як левыя, так і правыя, нейк безагаворачна прымаюць і падтрымліваюць гэтую агрэсіўную амерыканскую палітыку. Тэарэтычна і практычна памагаюць амерыканцам нішчыць іншыя народы. І тым самым дзяржаву і наш народ робяць заложнікамі авантурысцкай амерыканскай палітыкі. Амаль ва ўсе гарачыя месцы высылаем са „стабілізацыйнай місіяй" нашых хлопцаў, бо так амерыканцы хочуць. Фінансуем іх „місію" таксама мы. Стабілізацыйных жа месц, на жаль, не ўбывае, а ўсё прыбывае і прыбывае.*

*Цяжэй даецца „стабілізацыя", вастрэйшыя формы прыбірае яна. У некаторых месцах нашы хлопцы ўжо шчодра сваю і чужую кроў праліваюць... А за што?!. За тое, што гэтыя народы хочуць жыць па-свойму, а не па-амерыканску?! І сербы, і іракцы, і афганцы народы свабодалюбівыя, як і мы. Жывуць яны ад нас далёка і ніколі нам нават вады не замуцілі, а мы дапамагаем іх нішчыць. Ой, адрыгнецца нам такая неразумная палітыка...*

*Напрошваецца пытанне: ці не можна давесці да такой ідэальнай сітуацыі, раўнавагі, парытэтаў, якія б элімінавалі новыя бітвы і войны?!*

*Выглядае на тое, што толькі ў адным-адзіным выпадку. І аб гэтым выпадку ўжо выдатны англійскі паэт Уільям Блейк, які жыў на пераломе XVIII-XIX стагоддзяў, пісаў (яго прарочыя словы прыводжу ў перакладзе на рускую мову):*

*Настанет день — свершится правый суд,*
*Уравновесятся весов военных чаши —*
*Когда всех ваших наши перебьют,*
*А наших — ваши...*

*Вось да чаго, разявіўшы раты, прэ неразумнае чалавецтва...*

**Васіль САКОЎСКІ**

**Вачыма еўрапейца**

# Ліквідаваць рарытэт?



*— Пагражае нам ліквідацыя. Мы ў гэты момант у цяжкай фінансавай сітуацыі. Сёлета я прыняў адну асобу, але адразу на другі год, — прызнаўся дэпутатам сеймавай Камісіі па справах нацыянальных і этнічных меншасцей ды чыноўнікам з міністэрстваў унутраных спраў і адміністрацыі ды адукацыі айцец Лявонцій Тафілюк, заснавальнік і кіраўнік Іканапіснай школы на ўскраіне Бельска-Падляшскага.*

*Гэтая школа — рарытэт амаль у сусветным маштабе. Падобнага кшталту школы існуюць пры манастырах. Дзейнічае яна 15 гадоў. Цяпер на трох курсах займаецца 17 навучэнцаў, з якімі працуе дзевяць майстроў. Навучанне працягваецца чатыры гады. Выйшла адсюль 39 выпускнікоў, сярод іх — з Масквы, Гродна і Чыкага. Адна выпускніца — манахіня аднаго з каталіцкіх манастыроў у Чанстахове. Студэнты праходзяць па тэалагічнай праграме. Знаёмяцца яны з грэчаскай ды старажытнацаркоўнаславянскай мовамі. Іконы, якія тут узнікаюць, пішуцца як па заказу прыватных асоб, так і царкоўных прыходаў.*

*Захапляючыся тутэйшымі іконамі, адзін з дэпутатаў сеймавай Камісіі Аркады Фідлер заўважыў:*

*— Усе дарогі ідуць да іконы.*

*Старшыня камісіі не скрываў:*

*— Калі б гэтая школа перастала існаваць, было б гэта вялікай стратай для агульнанацыянальнай культуры.*

*Віцэ-міністр адукацыі Славамір Класоўскі ўголас разважаў:*

*— Можа, трэба было б задумацца, які орган у такой сітуацыі павінен курыраваць школу.*

*Прысутны ў час візіту ў школе а. Лявонція ўпаўнаважаны ваяводы па справах меншасцей Лешак Калеснік, спаглядаючы на адну з ікон Прачыстай, успомніў:*

*— Гэта мая радзінная ікона.*

*Застаецца пытанне: што зробяць дэпутаты і міністэрскія чыноўнікі, каб Іканапіснай школе ў Бельску-Падляшскім дапамагчы. У прынцыпе сярод асоб, так сказаць, звонку, у сапраўднасці аб праблемах ведаюць толькі (а, можа, і аж) яны. Журналісты польскамоўных СМІ не спадарожнічалі ім у час яе наведання. Падобна як мала іх цікавіла бурлівая сустрэча ў Гайнаўцы, якую здзімавала справа адабрання ў БГКТ дватацыі, размовы з беларускім асяроддзем у Падляшскай ваяводскай управе ці візіт у Музеі Малой айчыны ў Студзіводах у сям'і Фіёнікаў.*

*— Арганізацыйнай падставай нашага беларускага асяроддзя з'яўляецца сям'я, аб чым некаторыя нашы дзеячы забываюцца, — пераконваў гасцей Дарафей Фіёнік.*

*Аб такіх каштоўнасцях, якія „вырабляюцца" м.інш. у Іканапіснай школе ці Музеі Малой айчыны найчасцей упамінаецца галоўным чынам пры нагодзе выбараў. Даў гэтаму доказ самаўрад Падляшскага ваяводства. Выдаў (за грошы падаткаплацельшчыкаў?) каляровы буклет „Падляшскі выбар", на знакамітай паперы са шматлікімі фотаздымкамі, які галоўным чынам расхвальвае дзейнасці неўзабаве адыходзячай эсэльдоўска-пээсэлеўска-былойсамаабаронный управы: „Найважнейшыя вынікі дзейнасці самаўрада". Апынулася ў ім заява быццам перадвыбарчы лозунг: „Культурная, рэлігійная і нацыянальная разнароднасць з'яўляецца адной з найважнейшых адметнасцей Падляшскага ваяводства ў маштабе краіны і Еўропы. Таму дбайнасць аб захаванне культурнай тоеснасці з'яўляецца абавязкам тэрытарыяльнага самаўрада". Шкада толькі, што тая дбайнасць не можа ахапіць хоць бы бельскай Іканапіснай школы.*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# З новымі прапановамі

**Кандыдаты на войтаў і бурмістра ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта ідуць на самаўрадавыя выбары ў Гайнаўскім павеце з надзеяй на перамогу і рэалізацыю сваіх выбарчых праграм. Усе мае суразмоўцы загадзя размаўлялі з мясцовым насельніцтвам і аналізавалі магчымасці афармлення розных праектаў і спраў на мясцовым узроўні. Хочуць яны яшчэ да перадвыбарчай цішыні прадставіць свае прапановы выбаршчыкам і разам з гміннымі раднымі ад БНВК прасіць падтрымкі ў час галасавання.**

— Беларускі выбарчы камітэт быў заснаваны перад першымі самаўрадавымі выбарамі і двойчы ўдзельнічаў у выбарчай кампаніі на Гайнаўшчыне. У 1998 годзе ў Гайнаўскім павеце быў заснаваны Беларуска-народны выбарчы камітэт, які ўжо трэ-



Міхал Андрасюк

ці раз уключаецца ў выбарчую кампанію, — заяўляе Міхал Андрасюк, адзін з лідэраў і ўпаўнаважаны БНВК. — Некаторыя камітэты мяняюць свае названні, залежна ад палітычнай кан'юнктуры сваіх партый. Мы не маем чаго саромецца. Наша назва вядомая нашым выбаршчыкам і таму пойдзем з ёю на чарговыя выбары.

Міхал Андрасюк, выказваючыся ад імя БНВК, лічыць, што ў Гайнаўскім павеце вельмі важнае паляпшэнне інфраструктуры — мадэрнізацыя дарог, будова каналізацыі і водаправодаў.

— Трэба намагацца, каб у час фінансавых цяжкасцей у галіне аховы здароўя ўтрымаць у Гайнаўцы бальніцу. Важнае даканчэнне будовы ў Гайнаўцы крытага басейна, якая нядаўна распачалася. На Гайнаўшчыне патрэбная дэцэнтралізацыя турыстычнай дзейнасці. Мы засяроджваемся на Белавежы, а трэба развіваць турызм і агратурызм у іншых пушчанскіх і прыпушчанскіх гмінах. Трэба таксама намагацца, каб міждзяржаўны пераход у Полаўцах стаў міжнародным, праз які маглі б перасякаць мяжу жыхары розных краін, што спрычынілася б да развіцця гандлю, разбудовы інфраструктуры і стварэння новых месцаў працы, так, як у Кузніцы, — кажа радны Гайнаўскага павета Міхал Андрасюк.

**Міхал Андрасюк — кандыдат на войта Дубіцкай гміны**

Старшыня Самаўрадавага форуму ў РП Міхал Андрасюк з'яўляецца кандыдатам ад БНВК на войта гміны Дубічы-Царкоўныя.

— Я нарадзіўся ў Дубіцкай гміне і доўга тут жыў. Бачу, як хутка меншае колькасць яе жыхароў, — гаворыць Міхал Андрасюк. — Калі раней у гміне жыло больш за 4 тысячы чалавек, то зараз асталася толькі палова. Маладыя людзі ўцякаюць з гміны ў пошуках працы. Трэба на Дубіцкай зямлі стварыць новыя месцы працы, калі нават спачатку іх будзе мала. У выпадку ўсходняй часткі гміны людзі могуць зарабляць на агратурызме, а ў заходняй частцы гміны можна заняцца перапрацоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў.

Міхал Андрасюк часта наведвае бацькаўскую хату ў Войнаўцы і размаўляе з мясцовымі людзьмі.

— Я лічу, што ў Дубіцкай гміне патрэбныя новыя ідэі і думкі. Гміна мала карыстаецца еўрасаюзнымі фондамі, а грошы ад іх можна было б выкарыстаць на інвестыцыі ў галіне інфраструктуры або рамонты школ, якія зараз пустуюць. Можна было б выкарыстаць прыгранічнае распалажэнне гміны і адкрыць у пустуючых школьных будынках цэнтры трансгранічнай адукацыі, — кажа Міхал Андрасюк, звяртаючы яшчэ ўвагу на вадасховішча „Бахматы", якое трэба лепш прыстасаваць для турыстычных патрэб.

**Лявон Пшчолак — кандыдат на бурмістра Кляшчэляў**

— Я гаспадарую на экалагічнай гаспадарцы ў Пагрэбах, якую я пераняў ад бацькоў, — заяўляе Лявон Пшчолак, выпускнік гістарычнага факультэта Універсітэта ў Беластоку, які працуе таксама ў Папулярна-навуковым выдавецтве „Альбатрос". — Хачу я яшчэ рабіць дактарат па гісторыі і вучыцца на адміністрацыйным факультэце, бо зараз без адпаведнай адукацыі цяж-



Лявон Пшчолак

ка кіраваць гмінай.

Мой субяседнік з Пагрэбаў лічыць вельмі важнымі прыцягненне інвестараў у Кляшчэлеўскую гміну і абмежаванне беспрацоўя.

— Трэба ў Кляшчэлеўскай гміне заняцца інфраструктурай. Неадкладныя мадэрнізацыя і асфальтаванне гмінных і павятовых дарог, а таксама паляпшэнне якасці палявых дарог. У Кляшчэлях трэба мяняць азбестныя водаправодныя трубы на сучасныя і канчаць будову каналізацыі. Каналізацыйную сетку трэба таксама будаваць па вёсках, — кажа Лявон Пшчолак.

Спадар Лявон прыярытэтам лічыць супрацоўніцтва людзей розных асяроддзяў для дабра Кляшчэлеўскай гміны.

— Мы жывём у адным месцы і мусім супрацоўнічаць з сабой. Трэба пашыраць культурную прапанову для жыхароў Кляшчэлеўскай гміны. Калі б былі сродкі, добра было б у Кляшчэлях адкрыць ліцэй. Магла б гэта быць школа з дадатковым навучаннем беларускай мовы, — тлумачыць спадар Пшчолак. — Калі наша моладзь захоча даведацца, адкуль яна выводзіцца, трэба ёй у гэтым дапамагчы.

Лявон Пшчолак прапануе, карыстаючыся досведамі суседняй гміны, заснаваць у горадзе прадпрыемства камунальнай гаспадаркі. Мой суразмоўца цікавіўся таксама Рэпчыцкім вадасховішчам.

— Не апраўдалася ідэя будовы рэтэнцыйнага вадасховішча ў Рэпчычах, бо сцёкі сплываюць у рэчку Нурэц яшчэ перад басейнам ды забруджваюць і рэчку, і само вадасховішча, — кажа спадар Лявон. — Трэба размаўляць дзеля спынення забруджвання ракі.

**Міраслаў Баравік — кандыдат на войта Гайнаўскай гміны**

— Прапанова, каб я стаў кандыдатам на войта Гайнаўскай гміны, выйшла ад жыхароў гміны. Я таксама адсюль, бо нарадзіўся і жыў у Арэшкаве і там зараз знаходзіцца мая гаспадарка, якую абрабляю, — кажа Міраслаў Баравік, спецыяліст па справах малых і сярэдніх прадпрыемстваў у Бельскім інспектараце страховачнай фірмы ПЗУ.

Міраслаў Баравік у выпадку выбарчай перамогі мае намер шырока выкарыстоўваць еўрасаюзныя сродкі, рамантаваць дарогі і будаваць каналізацыю.

— Мы, праваслаўныя беларусы, павінны выкарыстаць нашу адметнасць у Польшчы і гэтым спосабам здабываць еўрасаюзныя грошы на



Міраслаў Баравік

нашы праекты, бо нявыкарыстаныя сродкі вяртаюцца ў еўрасаюзны бюджэт. Па прычыне нашага знаходжання каля Белавежскай пушчы таксама можна здабыць грошы на інвестыцыі ў галіне аховы асяроддзя. Аднак нашы людзі павінны мець шырокі доступ да пушчы, — гаворыць Міраслаў Баравік.

Мой субяседнік лічыць патрэбным хуткую будову гімнастычнай залы пры Падставовай школе і Публічнай гімназіі ў Дубінах.

— Моладзь трэба заахвочваць уключацца ў культурнае і грамадскае жыццё. Маладыя павінны захоўваць сваю мову, традыцыю і культуру і ўмець гаварыць па-свойму. Трэба намагацца, каб больш асоб хацела ў школах вучыцца беларускай мове, — гаворыць Міраслаў Баравік і звяртае ўвагу на справы эканоміі (здабыў ён вышэйшую эканамічную адукацыю ў Беластоку). — Трэба ствараць умовы для гаспадарчага развіцця нашай гміны. Трэба ставіць на агратурызм і іншую гаспадарчую дзейнасць. Хацеў бы я паніжаць падаткі для тых, хто пачынае дзейнасць у нашай гміне.

**Юрый Васілюк — кандыдат на войта Чыжоўскай гміны**

Юрый Васілюк, які дзяцінства і маладосць правёў у Курашаве, чатыры гады назад перамог на самаўрадавых выбарах, стаў войтам Чыжоўскай гміны і кіруе ёй па сённяшні дзень.

— За чатыры гады зрабілася ў гміне вельмі многа. Большасць пастулатаў з мінулай выбарчай кампаніі ўдалося рэалізаваць або рэалізуем цяпер, — кажа войт Юрый Ва-



Юрый Васілюк

сілюк (выпускнік Політэхнічнага інстытута ў Беластоку). — Закончылі мы будову гміннай управы, якая пачалася яшчэ ў 1995 годзе. Зрабілі мы ў адным будынку адміністрацыйны цэнтр разам з банкам, поштай і паліцыяй. Збудавалі мы ачышчальню сцёкаў і распачалі будову каналізацыі. Удалося нам паскорыць перабудову гмінных, павятовых і палявых дарог.

Мой суразмоўца кажа, што за апошні тэрмін на тэрыторыі Чыжоўскай гміны было асфальтаваных або прыкрытых бітумічнай паверхняй 11 кіламетраў гмінных і павятовых дарог. Зараз рамантуецца будынак Комплексу школ у Чыжах. У гміне ладзіліся вялікія культурныя мерапрыемствы, з археалагічным фэстам, на якіх выступіла шмат беларускіх калектываў. Пасля рэарганізацыі гміннай управы і скарачэння колькасці яе работнікаў, гмінныя ўлады атрымалі сертыфікат „Празрыстая гміна".

— У бліжэйшы час я планую разбудоўваць каналізацыю і перабудоўваць дарогі. Будзем мы канчаць рамонт чыжоўскай школы, вясковых клубаў і будынкаў прыстасаваных у паасобных сёлах на патрэбы добраахвотнай пажарнай аховы. Перад школай хочам збудаваць пляцоўку для гульняў і адпачынку. Прадбачваем таксама будаваць застаўку на рэчцы Локніцы і ачысціць ад мулу частку ракі каля Падрэчан, што будзе служыць для адпачынку і турыстычных патрэб, — пералічвае Юрый Васілюк. — Па меры магчымасцей будзем рэалізаваць прапановы, з якімі звернуцца да нас жыхары гміны. Трэба надалей працаваць з улікам таго, што найважнейшае для гміны — яе жыхароў.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

## *Недапушчальныя дзеянні*

Мы ўжо прызвычаіліся да максімальнага выкарыстоўвання працаўнікоў работадаўцамі. І ў гэтай з'яве няма нічога непрыстойнага да гэтай пары, пакуль ідзе пра эфектыўнае выкарыстанне часу працы ў адпаведнасці з дамовай на працаўладкаванне работніка.

Але несумленным і немаральным з'яўляецца прымушанне падначаленых сабе працаўнікоў да выдавання сваіх грошай насуперак іхняй волі. А так менавіта дзеецца ў дзяржаўнай установе Польская пошта. Прымушае яна сваіх працаўнікоў купляць нікому непатрэбныя філатэлістычныя абанементы.

Сам абанемент гэта вельмі добрая форма калекцыянаваць усе серыі выпушчаных у даным годзе марак. І філатэлісты, якія збіраюць польскія маркі, ахвотна карыстаюцца такой формай калекцыянавання. Горшая справа, калі на тэрыторыі дзеяння паштовага аддзялення філатэлістаў няма, а так часта бывае ў сельскай мясцовасці.

Аднак дырэктараў ваяводскіх структур Польскай пошты гэта не цікавіць — кожнае паштовае аддзяленне атрымоўвае ад іх план продажу філатэлістычных абанементаў, які абавязкова трэба выканаць. Гутарыў я аб гэтым нядаўна на адной вясковай пошце, але па просьбе начальніка гэтага паштовага аддзялення не назаву мясцовасці. Штогод трэба яму прадаць чатыры абанементы чыстых марак і два пагашаных. Пагашаныя маркі значна таннейшыя і яму ўдалося намовіць на куплю мясцовых школьнікаў. Але на непагашаныя маркі няма аматараў і па неабходнасці самі паштальёны становяцца „філатэлістамі". З маркамі яны робяць так, што папросту прадаюць іх для франкавання пасылак, але за паслугу за кожны абанемент плацяць са сваёй кішэні. І хаця гэта невялікія грошы, усяго некалькі злотых, але якім правам? Гэта чыстая поскудзь у выкананні кіраўнікоў дзяржаўнай установы. Ім самае важнае — паказаць у справаздачы як гэта ў нашай цудоўнай краіне паспяхова развіваецца філатэлізм! А калі работніку штосьці не падабаецца, тады пайшоў вон! На яго месца прыйдуць іншыя.

Слушны пастулат дэкамунізацыі павінен перш за ўсё ўлічыць розумы чакаючых спакойнай пенсіі старых заслужаных дзеячаў, якія сёння займаюць цёплыя, бяспечныя пасады.

**М. Ц.**

## *Дапамажыце інвалідам*

На дзвюх гарадскіх аўтобусных лініях у Гайнаўцы ездзяць звычайныя аўтобусы і ні адзін з абніжанай падлогай. Прадпрыемства гарадской камунікацыі ў гэтым горадзе не мае, як дагэтуль, аўтобусаў дастасаваных для патрэб інвалідаў. А яны ж неабходныя, каб маглі імі карыстацца інваліды-калясачнікі і маці з дзіцячай каляскай.

Гарадскія ўлады Гайнаўкі павінны неадкладна заняцца гэтай справай і дапамагчы перавозчыку купіць неабходныя аўтобусы. Такія сродкі грамадскага транспарту павінны ездзіць хаця б час ад часу на кожнай з дзвюх гайнаўскіх ліній.

**(мох)**

# Бура ў Гайнаўцы



*Дэпутат Яўген Чыквін паказвае калегам беларускія адметнасці ў Музеі*

**У час сустрэчы сеймавай Камісіі па справах нацыянальных і этнічных меншасцей у Гайнаўцы было вельмі бурліва. Улады Галоўнага праўлення БГКТ не скрывалі свайго абурэння рашэннем аб адняцці ім на тры гады датацыі.**

— Гэтае дзеянне спрычыніцца да катастрофы беларускай культуры! — грымеў старшыня Таварыства Ян Сычэўскі.

Праліліся таксама і слёзы. Сустрэча дэпутатаў з самаўрадаўцамі, дзеячамі беларускіх арганізацый, галоўным чынам звязаных з БГКТ, ды з Беларускага аб'яднання студэнтаў (разам чалавек пад пяцьдзесят), адбылася ў Музеі і асяродку беларускай культуры, які БГКТ яшчэ да нядаўна хацела пераняць. Камісію з 16 асоб прадстаўлялі адно старшыня Яўген Чыквін (СЛД), прадстаўнік нямецкай меншасці Генрык Кроль, кашуб Казімеж Клейна (ПО) ды Аркады Фідлер (ПО), сын вядомага падарожніка і пісьменніка. Гэты апошні яшчэ да спаткання ў Гайнаўцы, распытваны „Нівай", чаму рашыўся на працу ў меншаснай камісіі, адказаў:

— У час падарожжаў па розных краінах свету з маім бацькам я ўвесь час сустракаўся з меншасцямі.

На пачатку сустрэчы ў Музеі ён паўжартаўліва прызнаўся:

— Я тут прадстаўляю польскую меншасць!

На сустрэчу прыбылі таксама прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якое куруе нацыянальныя меншасці, а таксама і Міністэрства адукацыі.

Ян Сычэўскі прамовіў як першы. Ягонае выступленне працягвалася паўгадзіны:

— БГКТ апынулася ў катастрафічнай сітуацыі, калі гаварыць аб існаванні, як у арганізацыйным вымярэнні, так і звычайным, людскім.

Аб парушэнні Таварыствам закону аб публічных фінансах (м.інш. былі пабудаваны ўсходы ў сядзібе Галоўнага праўлення за грошы, якія не былі прызначаны на інвестыцыйныя мэты) гаварыў старшыня, завяраючы:

— Няправільнасці ў БГКТ гэта звычайная памылка, якая вынікла з-за няведання.

І далей:

— Гэта было парушэнне закону ў няпоўным адным працэнце. Рэдка так бывае, каб было суперідэальна. Вынікі гэтага рашэння пакінуць адбітак на ўсёй беларускай культуры.

Як можна было зразумець, старшыня Сычэўскі меў прэтэнзіі да МУСіА за назначэнне — на яго думку агромнай — датацыі арганізатарам дажынкавага фэсту ў Залуках пад Гарадком. Пералічыў суму 30 тыс. злотых.

— Калі за такія грошы будзе арганізавацца толькі адзін фэст, дык гэта пагражае развалам беларускай культуры, — палохаў.

Дасталася таксама Беларускаму аб'яднанню студэнтаў, якое пасля БГКТ на свае праекты атрымала 200 тыс. зл., між іншым, на юбілей Аб'яднання, „Падляшскія запусты" ці выданне кампакт-дыскаў CD і DVD:

— Выдаванне CD ці DVD не з'яўляецца альтэрнатывай да таго што рабіла БГКТ.

Разважаў таксама ўголас як выбрацца з сітуацыі, калі пасля адняцця датацыі БГКТ, запазычанасць арганізацыі сягае найменш 400 тыс. зл. І дадаў:

— Дык што нам зрабіць з гэтай запазычанасцю?

Урэшце прывёў словы праф. Анджэя Стэльмахоўскага, якія прагучалі з яго вуснаў у той самы дзень на інаўгурацыі акадэмічнага года на Універсітэце ў Беластоку:

— „Закон мае быць мастацтвам красы і справядлівасці". Я гэтага абсалютна не адчуваю.

Данута Главацка-Мазур, выконваючая абавязкі дырэктара Дэпартамента нацыянальных і этнічных меншасцей у МУСіА тлумачыла:

— Вельмі нам залежыць на тым, каб крытэрыі заяў на датацыі былі як найбольш аб'ектыўныя. Пабудову лесвіцы ці паслугі на аўтамыйцы цяжка прылічыць да „дзейнасці мастацкіх калектываў". Якія мы цуды выраблялі, каб знайсці юрыдычныя асновы для непрымянення правіл аб фінансах.

Пры нагодзе спадарыня дырэктар паінфармавала ўдзельнікаў гайнаўскай сустрэчы аб тым, што Ян Сычэўскі паспеў ужо, да канца тэрміну падачы заяў на наступны год, стаць заснавальнікам Таварыства беларускай культуры (шырэй пісалі мы аб гэтай справе ў папярэднім нумары „Нівы"), і ТБК падало свае заявы:

— Я заахвочваю ТБК да падавання заяў на рэшту нявыкарыстанай сумы, з пулькі адабранай у БГКТ, яшчэ ў 2006 годзе.

Сумненні ўдзельнікаў сустрэчы выклікаў прафесіяналізм асоб, якія ўваходзяць у склад камісіі, разглядаючай заявы на датацыі. Данута Главацка-Мазур запрапанавала, каб аб тое, якія з заяў маюць разглядацца ў першую чаргу, прапанавала Супольная камісія ўрада ды нацыянальных і этнічных меншасцей, якая дзейнічае ў адпаведнасці з законам аб меншасцях.

Спадарыню дырэктар у справе рашэння датычнага БГКТ падтрымаў дэпутат Клейна:

— Цяжка сабе ўявіць кіраванне публічнымі фінансамі, калі б не было такіх санкцый. Гэтыя справы трэба пільнаваць па-прыярытэтнаму. У іншым выпадку ў публічных фінансах будзе царыць балаган.

Заклікаў ён таксама стварыць Раду беларускіх арганізацый па справах кантактаў з дзяржаўнымі органамі, м.інш. таксама і з МУСіА.

У дыскусію ўключыўся Павел Бушко з варшаўскага БАСу. Папракаў ён улады Таварыства ў палітыканстве:

— Чаму такая шаноўная арганізацыя як БГКТ са сваёй сядзібай ды лесвіцай не выйшла хоць бы да нашай арганізацыі з прапановай „давайце, зробім гэта разам", калі фактычна сутнасцю БГКТ з'яўляюцца фэсты і калектывы.

Тады не сцярпела дачка сакратар ГП БГКТ Валянціны Ласкевіч, Ева, адна з вядучых актывістак Таварыства:

— Мы працуем ад рання да вечара, увесь тыдзень, у суботы і нядзелі! А вам, як студэнту, хапіла б на тое столькі часу?

Віталь Бонда:

— Ні на адным мерапрыемстве БГКТ не было ніколі палітычнага акцэнту!

Павел Бушко:

— Лухта!

Ілона Карпюк, старшыня БАС:

— Мы займаемся іншай дзейнасцю, але мы ў змозе суарганізаваць імпрэзы БГКТ.

Віталь Бонда:

— Гэта палітычнае ганенне адной асобы: Яна Сычэўскага. У міністэрстве не ведаюць, як выглядае той кашуб ці беларус. Можа ім здаецца, што такі сядзіць у зямлянцы?

Слязьмі праліла свае жалі войт Бельскай гміны Яўгенія Асташэвіч:

— Былі фэсты, а цяпер іх няма. Вы ж да канца зніштожыце нашу культуру!

Дэпутат Яўген Чыквін разважаў уголас ці ў справе БГКТ не павінна быць накіравана данясенне ў пракуратуру, як гэта зрабіла Найвышэйшая кантрольная палата з „Нівай". Данута Главацка-Мазур, аднак, адказала:

— Мы тут не маем дачынення да парушэння крымінальнага кодэкса.

Валянціна Ласкевіч:

— Адкуль мы маглі ведаць, што тая лесвіца гэта фінансавае злачынства?

Урэшце ўзяў голас гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук:

— Грошы на меншасці з МУСіА выкарыстоўваліся б лепш, калі б перадаваліся ў форме субвенцыі самаўрадам. Яны лепш вырашалі б, каму тыя грошы назначыць.

І далей:

— Мы не мусім абавязкова шукаць ратунку ў сеймавай Камісіі. Самі сарганізуем, хоць бы тут, у музеі, беларускі круглы стол.

Мікола Бушко, шматгадовы арганізатар Фестывалю царкоўнай музыкі:

— Барані Бог, каб сродкі ішлі на самаўрады.

Дэпутат Генрых Кроль на канец перасцярог:

— Прапанова старосты аб арганізаванні беларускага круглага стала — карысная. У іншым выпадку пагражаюць вам клопаты. У мінулым здаралася, што ў шмат якіх сітуацыях прабавалі вамі маніпуляваць.

**Раіна СТЭФАНЧУК**

# Далёкае падарожжа ў старажытную Эладу

*(заканчэнне з 42 н-ра)*

**На наступны дзень мы мелі ўжо ехаць у Афіны, каб мець крыху часу на наведанне сталіцы Грэцыі. Якім вялікім было нашае здзіўленне, калі даведаліся, што якраз у гэты дзень — 24 чэрвеня, пачаўся аднадзёнy агульнадзяржаўны страйк грэчаскіх банкаў і чыгункі. Гэта прымусіла нас змяніць дату выезду на раніцу наступнага дня. Дзень страйку мы правялі на ўспамінах усіх цудоўных хвілін і цікавых здарэнняў, у якіх мы прымалі ўдзел, а было што ўспамінаць.**

Калі б я ведала раней, што так будзе выглядаць нашае падарожжа ў Афіны, мы пэўна паехалі б прынамсі некалькі гадзін пазней. На вакзале ў Ларысе натоўп людзей чакаў цягніка ў Афіны. Мы ехалі 4,5 гадзіны і ўвесь гэты час я правяла седзячы на ручцы крэсла. Гэта было адно з цікавейшых, але адначасова найменш выгадных падарожжаў цягніком у маім жыцці.

Афіны прывіталі нас вельмі прыгожым надвор'ем. На вакзале сустрэла нас сяброўка нашых гаспадароў. У яе мы маглі пераначаваць. Яна дапамагла нам зарыентавацца ў тапаграфіі горада. У Афінах мы былі каля 40 гадзін.

Побыт у Афінах мы пачалі ад Пірэя. Найхутчэй і найвыгадней перамяшчацца па горадзе на метро. Мае яно тры лініі, якія перакрыжоўваюцца ў найважнейшых месцах горада, дзякуючы чаму можна перасесціся ў патрэбным напрамку. Станцыі метро добра абазначаныя і вельмі чыстыя. Я яшчэ нідзе ніколі не бачыла такой колькасці суднаў, як у Пірэі. Частка з іх гэта таварныя судны, але большасць — пасажырскія. Такі спосаб падарожжа вельмі папулярны ў Грэцыі. Пірэй гэта найбольшы грэчаскі порт, з якога судны плаваюць хіба на ўсе грэчаскія астравы. Зусім выпадкова, калі мы шпацыравалі па Пірэі, мелі нагоду ўбачыць шлюбную пару адразу пасля выхаду з царквы і прыгожа апранутых гасцей. Потым мы вярнуліся на Плошчу Сынтагма, з якой пачалася нашая грэчаская прыгода. У гэты вечар плошча выглядала цудоўна — прыгожа асветленая, з вялікай колькасцю шчаслівых людзей з усмешкамі на тварах. Я была ўжо ў некалькіх месцах у свеце, але яшчэ нідзе не сустрэла так шчаслівых і таварыскіх людзей як грэкі. Хаця час на зямлі, здавалася б, бяжыць таксама, усюды гадзіна гэта 60 мінут, а мінута — 60 секунд, то ў Грэцыі гэта праўда не спраўджаецца. Там час плыве памалей, жыццё спакайнейшае, не выклікае стрэсу, магу сказаць яно нармальнейшае, чым у іншых частках свету. Можа здацца, што ў людзей няма ніякіх клопатаў ні турбот. Усміхаюцца яны да сябе на вуліцы. У Польшчы такое захаванне магло б здацца падазроным. У Грэцыі размова на вуліцы з зусім незнаёмым чалавекам з'яўляецца чымсці зусім натуральным. Так мы пазнаёміліся з двума сімпатычнымі хлопцамі з Сірыі. А ўсё дзякуючы шлюбу, а дакладней, дзякуючы падарунку, які атрымоўваюць усе запрошаныя на шлюб госці. Гэта вельмі прыгожа запакаваныя цукеркі, да якіх далучаецца картачка з імёнамі і прозвішчамі маладажонаў. Хаця мы не былі запрошаныя на шлюб, але такі падарунак таксама атрымалі. Менавіта гэта ён выклікаў зацікаўленне незнаёмага, які загаварыў да нас на вуліцы. Сказаў толькі адно слова: „wedding” (шлюб) і гэтае слова стала прычынай далейшай размовы.



Вечарам мы пайшлі на шпацыр. Ускараскаліся на Пнікс — адно з васьмі ўзгоркаў у межах Афінаў. Гэты невялікі ўзгорак калісьці быў трыбунай для выдатных грэчаскіх прамоўцаў. Сёння гэтае месца ахвотна наведваюць як жыхары Афінаў і ўсёй Грэцыі, так і турысты. Уваход на Пнікс у абутку з'яўляецца даволі цяжкім, таму што галоўны падыход ёсць сапраўды вельмі слізкі, з прычыны колькасці людзей, якія хадзілі гэтай дарогай. Найвыгадней уваходзіць туды несучы абутак у руцэ. Мы трапілі на Пнікс у найлепшы момант дня, калі пачало заходзіць сонца. Бачылі непаўторны захад сонца і не маглі адарваць ад яго вачэй.

Каб прыемна закончыць гэты дзень, мы пайшлі на доўгі шпацыр на Плаку — старадаўнюю частку Афінаў каля падножжа Акропалю. Там большасць вуліц закрытая для машын. Дзякуючы гэтаму шпацыр быў сапраўднай прыемнасцю. Там мноства рэстаранаў і кавярняў. У кожных дзвярах стаяў афіцыянт і заахвочваў наведаць менавіта іхнюю кавярню. Усе яны былі вельмі мілыя. Калі даведаліся, што мы прыехалі з Польшчы, аказвалася, што ведаюць асноўныя звароты і пасобныя словы на польскай мове. Гэта быў вельмі цёплы вечар, таму, як сотні іншых турыстаў, мы таксама селі ў прыемным месцы, пілі каву гледзячы на Акропаль. Я заказала марожаную каву з цукрам, марожаным і са смятанкай. Так смачнай кавы я не піла ніколі раней.

У Грэцыі вельмі характэрнымі з'яўляюцца позния гадзіны спажывання ежы. Сяброўскія сустрэчы адбываюцца круглыя суткі і так доўга, як яны трываюць, людзі гуляюць. Гэта лічыцца нормай.

Нядзелю, наш апошні дзень як у Афінах, так і ў Грэцыі, пачалі мы ад удзелу ў царкоўным набажэнстве. Гэта быў вельмі гарачы дзень і, нягледзячы, што ў грэчаскіх цэрквах ёсць лаўкі для вернікаў, людзі млелі. Пасля набажэнства мы хуценька паехалі на метро на Плошчу Сынтагма. Перад будынкам парламента знаходзіцца магіла невядомага салдата. Перад магілай стаяць на варце яўзоны — салдаты апранутыя ў традыцыйны грэчаскі строй: чырвоныя берэты, зімою ў цёмныя тунікі, летам у чырвоныя камізэлькі, белыя спаднічкі са зборкамі і драўляныя чырвоныя дзеравянікі з вялікімі пампонамі. Урачыстая змена варты адбываецца ў кожную нядзелю ў адзінаццаць гадзін перад поўднем. Мы пакарысталіся нагодай, каб на гэта паглядзець.

Чарговым месцам, якое трэба наведаць у Грэцыі, гэта Афінскі акропаль — самы вядомы „верхні горад” ва ўсім свеце. З-за недахопу часу мы пайшлі туды ў самыя гарачыя гадзіны дня. Летам найлепш наведваць акропаль раніцай, а зімой — адразу пасля поўдня, калі не вельмі горача, няма яшчэ натоўпу людзей, а на гарызонце горы нібыта зліваюцца з блакітам неба. Перад уваходам на акропаль трэба купіць білет. Ён дае права наведаць некалькі іншых гістарычных помнікаў у Афінах, між іншым, рымскі форум, святыню Зеўса, могільнік Керамікас. Мы мелі нагоду наведаць музей, які знаходзіцца на акропалі. У ім сабраныя скульптуры знойдзеныя ў „верхнім горадзе”. Захаваліся, між іншым, чатыры арыгінальныя карыятыды — статуі жанчын, якія на сваіх галовах падтрымоўваюць скляпенне будынка. Цяпер статуі знаходзяцца ў шклянай вітрыне з азотам, каб іх усцерагчы ад знішчэння. У музеі зусім забароненае фатаграфаванне экспанатаў. Мы далучыліся да групы польскіх турыстаў з гідам. Дзякуючы гэтаму мы маглі даведацца больш чым напісана ў даведніках. Мы дзве гадзіны аглядалі руіны на акропалі. У тым ліку, зразумела, Парфенон — адзін з самых незвычайных будынкаў, якія збудаваў чалавек. За мастацкі бок пабудовы Парфенона і яго скульптурнае аздабленне адказны быў выдатны скульптар Фідый. Стварыў ён, між іншым, статую Афіны Парфенас з золата і слановай косці для храма Парфенон. Пабудова храма трывала дзесяць гадоў і была закончана ў 438 годзе да нашай эры. Цяпер Парфенон забяспечаны тросамі перад рукамі турыстаў, якія часта хочуць узяць адтуль хаця б адзін каменьчык на памяць. Вельмі дрэнны ўплыў на скульптуры маюць няўстойлівае надвор'е і забруджанае паветра. Мы аглядалі таксама святыню Зеўса, якая знаходзіцца на паўднёвы ўсход ад акропалю. Яна мела 107 метраў вышыні і была найвышэйшым храмам ва ўсёй Грэцыі.

Што мне засталося ад дванаццаці дзён, праведзеных у зямным раі? Вялікая колькасць здымкаў, да якіх таксама цяпер, хаця ўжо мінуў год, вяртаюся вельмі ахвотна, жывыя ўспаміны, кампакт-дыскі з грэчаскай музыкай, даведнікі па Грэцыі, якія я пераглядала сама не памятаю колькі разоў і ўпэўненасць, што калісьці туды вярнуся. Вярнуся да гэтага, што ўжо ведаю і наведаю зусім новыя месцы, якіх яшчэ многа ў Грэцыі. Гэта мая чарговая мара, а я ж ужо ведаю, што мары часам здзяйсняюцца.

**Анна ДЭМЯНЮК**

# *Шануйма натуру*

Першую нядзелю кастрычніка правёў я ў падарожжы па Бельшчыне. Раніцай а $6^{40}$ рэйкавым аўтобусам адправіўся я з Чаромхі ў Падбелле, адтуль на ровары падаўся ў вёску Мокрае. Наведаў я жончыну сястру. Калі запрашаў швагерку да сябе ў госці, пачуў ад яе такі вось адказ:

— Не паеду. Няма часу, грыбочкі збіраю. Сёлета адных баравікоў шмат насушыла, на зіму намарынавала. Зараз за лісічкамі ганяюся, штодзень вядзерца прыношу. Скупшчык Каліш з Чаромхі прыязджае, раней па 12 зл. за кілаграм плаціў. Як грыбоў больш стала, дык два злоты абараваў. Гэта нядрэнны прыбытак. За рабочы дзень каля пяцідзесяці злотаў выходзіць. А Юрку, сыну, значыцца, прыватны прадпрымальнік летам на будове ў Бельску-Падляшскім за працадзень плаціў па 25 зл. У Дубяжыне пункт скупкі грыбоў знаходзіцца, але там менш плацяць, — сказала сваячніца. — Просім затым Каліша, каб да нас прыязджаў...

З Мокрага на ровары падаўся я дамоў. Больш за дваццаць пяць кіламетраў будзе. Але мяне гэта не палохала, бо прывык я да такіх вандровак. У Дубяжыне не застаў у хаце швагра. Падаўся затым у Пашкоўшчыну. За дубяжынскім могільнікам, з правага боку перад вёскай Алекшы, знаходзіцца бярозавы лясок. І што я там пабачыў? Гурбы смецця ў рове і ў лесе. Безгаспадарная звалка. Не магу ўцяміць, чаму людзі так легкадумна і забруджваюць натуру. Хто гэта робіць, дубяжынцы ці алякшоўцы, не магу сказаць. Адно пэўнае, чужы таго не зрабіў. Шкада, што мясцовая грамадскасць не дбае пра сваю візітную картачку. У народзе кажуць: „Як нас бачаць, так пра нас пішуць”. А варта памятаць, што прырода, гэта прыяцель чалавека. Яна забяспечвае нас чыстым паветрам, ягадамі ды грыбамі. А людзі пра гэта не дбаюць. Шануйма затым натуру!

Праязджаў я праз Алекшы, Градалі, Пашкоўшчыну, Рыгораўцы, Маліннікі, Сухавольцы ды з Кляшчэляў у Кузаву праз Рэпчычы. Шмат цікавага я там пабачыў, але пра гэта распавяду ў наступных допісах.

**Уладзімір СІДАРУК**

# *Пра падворкі*

21 верасня г.г. у Нараўцы войт і старшыня Гміннай рады ўручылі заслужаныя ўзнагароды пераможцам у конкурсе на самы прыгожы і гасцінны падворак у Нараўчанскай гміне.

Гран-пры атрымала Люба Леанеўская з Міклашэва, першае месца — Антон Конкель з Нараўкі (вул. Гайнаўская), два раўнапраўныя другія месцы — Яўгенія Шабелян з Семяноўкі і Зіна Лапінская з Плянты ды тры раўнапраўныя трэцця месцы — Лена Харкевіч з Плянты, Вера Харкевіч з Нараўкі (вул. Гайнаўская) і Зоя Рубчэўская з Нараўкі (вул. Аградовая). У іх дамы таксама ўзорнага парадку.

**(мох)**

# зорка
для дзяцей і моладзі




Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

## *Гражынка і Грак*

*— 45 —*

*— Яна мне чырвоным адзначыла словы „тваю” і „твайго” ў адным сказе! — Гражынка была не менш чырвоная ад гэтых паметак, якія ў яе сшытку паставіла настаўніца польскай мовы на „Лісце Багуславе”. Гэта была хатняя праца — напісаць ліст-параду дзяўчынцы, фрагменты дзённіка якой друкаваліся ў падручніку па літаратуры. У сям'і гераіні расказа паявіліся праблемы — бацькі перасварыліся, тата пакінуў хату, дома засталіся беспрацоўная мама ды Багуся з меншым братам. Вучні мелі дома напісаць ліст Багусі — суцешыць яе, дадаць духу, абнадзеіць. І гэтак аж на дзве старонкі ў сшытку!*

*— А што вы дагэтуль напісалі ў сшытку? — пацікавілася мама. — Гэтак мала? Ужо ж кастрычнік канчаецца?! Мы ў вашыя гады пісалі дома амаль тыдзень у тыдзень хатнія працы, і не енчылі, што „аж на дзве старонкі”!*

*— У нас ёсць яшчэ два сшыткі на практыкаванні. Там адно дапісваем па пару слоў, што дзе куды трэба. Усё іншае надрукавана. Гэта каб менш пісаць.*

*Бабуля схапілася моўчкі, ды вельмі красамоўна, за галаву. А мама цяжка ўздыхнула.*

*— Ну дык я напісала на старонку адну, пані напісала, што „праца цікавая”.*

*— Камусьці яшчэ напісала, што „праца цікавая”? — пацікавіўся Грак. — Там у вас толькі пішуць ад „палкі” да шацёркі, а не дадаюць нічога больш. Сам бачыў.*

*— А калі ты бачыў у мяне „палу”?! — Гражынка азірнулася на маму.*

*— Гр-р-гр... — пракаўкнуў Грак тое, што раз убачыў, і лыпануў вокам на Гражынчыну маму, якая адразу наставіла вуха.*

*— Значыць, пахваліла цябе настаўніца, — бабуля ўзіралася ў сшытак Гражынкі, перачытваючы напісанае. — Ну, магла б ты прыгажэй літаркі выводзіць. Нашто я табе „вечнае” пяро купіла, самога „паркера”?!*

*— Не набрала я была атраманту ў пяро... Самапіскай хутчэй. Пахваліла... І „т” ёй не падабалася!*

*— Бачу, ты звярталася да адраcаткі з малой літары. Праўда, настаўніца „пераборшчыла”. Лагічна, што ты мусіла ў адным сказе напісаць два разы „тваё”. „Я пра* ***тваю*** *гісторыю даведалася з* ***твайго*** *дзённіка”.*

*— Р-р-рагічна! — уцешыўся Грак, бо не спадабаліся былі яму чырвоныя паметкі ў Гражынчыным сшытку.*

***Міра ЛУКША***



Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

## Госці ў „тройцы”

— Вельмі ж гэта кранальна! — да такой высновы дайшлі члены сеймавай Камісіі па справах нацыянальных і этнічных меншасцей і прадстаўнікі двух польскіх міністэрстваў — унутраных спраў і адміністрацыі ды адукацыі ў час выступлення мастацкіх калектываў Комплексу беларускіх школ у Бельску-Падляшскім. У калідоры Пачатковай школы н-р 3 выступілі „Журавінка”, „Вясёлка”, „Капрыз” і танцавальная група „Світанак”. Гасцям з Варшавы спявалі яны беларускія песні, дэкламавалі па-беларуску вершы. Паказаліся ў нацыянальных строях і ў — сапраўды — эстрадных.

— Ой, як прафесійна гэтыя маладыя людзі спяваюць ды танцуюць! — захаплялася адна з працаўніц Міністэрства адукацыі.

Пасля прэзентацыі, у час сустрэчы „для дарослых”, віцэ-міністр адукацыі Славамір Масоўскі не скрываў свайго захаплення:

— Я віншую дырэкцыю, настаўнікаў і моладзь. Я пад вялікім уражаннем ад выступлення дзяцей і моладзі. Гэта доказ, што ваша школа выконвае выхаваўчыя заданні ва ўсіх адносінах!

**(раст)**



Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

**Пазнаем алфавіт**

## Літара „Ƌ”

Да маленькай Сінічкі прыйшоў у госці маленькі Верабейка. Як заведзена, прывіталіся яны, а пасля Верабейка і кажа:

— Сінічка, давай літару пабудуем.

Здзівілася Сінічка:

— Літары пішуць, а не будуюць.

— А мы назбіраем сасновых іголак і пабудуем.

— Так можна, — пагадзілася Сінічка. — Якую літару ты хочаш пабудаваць?

— Літару „Б”. Яна вельмі гучная. Вось паслухай: бэ, бэ...

— Бэ, бэ, — паўтарыла Сінічка і дадала: — Мне таксама гэтая літара падабаецца.

Назбіралі яны сасновых іголак і пачалі будаваць літару „Б”. Адну іголку паклалі прама; злева, злучыўшы, паклалі другую, меншую, да другой — трэцюю, да трэцяй — чацвёртую. А апошнюю, пятую, зверху паклалі. Вось як у іх выйшла: Ƌ.

Стаяць, дзівяцца.

— Прыгожая, — цешыцца Сінічка.

— Зараз мы сюды ўсіх лясных птушак паклічам, — радуецца Верабейка. — Няхай вучацца пісаць літару „Б”.

А вы згодныя з Верабейкам і Сінічкай?

*(працяг будзе)*

**Аляксей ЯКІМОВІЧ**

**„Займальны алфавіт”**



ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

# Муха ціп-топ!

— (2) —

Сёння наш клас пабываў на экскурсіі ў Кнышынскай пушчы. Мы паехалі з нашай выхавацелькай Аўрэліяй і класам II „б”.

У аўтобусе нашая пані гід распавядала як у часы СССР было добра і як цяпер дрэнна жывецца. Яе ніхто не слухаў, мы смяяліся і спявалі песні. Найгалasней спявала Соня, таму экскурсаводчыца паклікала яе да сябе і сунула ў рукі мікрафон.

— Спявай! — загадала неяк злосна.

Соня вельмі нячыста праспявала чатыры песні. Мы прыкідваліся, што Соніны песні найпрыгажэйшыя ў свеце і заўзята пляскалі ёй у далоні. Што тут ні казаць — мы былі пад уражаннем, што Соня ўсё ж адважылася і заспявала сола.

У Супраслі мы падзяліліся на групы: клас II „б” пайшоў у музей, а мы пацягнуліся на шпацыр у лес. Наша выхавацелька ішла і ўглядалася ў хмаркі, а мы бегалі дзе толькі хацелі. А калі ўжо ўсе вярталіся ў музей, нехта прыкмеціў, што няма з намі Ігара і Паўла. Мы не сказалі Аўрэліі пра „дэзерціраў”. Дваццаць хвілін пазней наш сябра Алік атрымаў эсэмэску ад Ігара. Ён пісаў: *Мы з Паўлам сядзім у „Pogodzie Express”. Праз дваццаць хвілін будзем ужо ў Беластоку.*

— Уоў!!! — пракаментавалі мы тую навіну.

Калі мы прыйшлі ў музей, нам раздалі білеты, а наша пані Аўрэлія не прыкмеціла, што яе група нікне ў вачах.

— Спадарыня Янкоўская, асталіся ў нас два білеты, — паінфармавала нашу выхавацельку экскурсавод.




— Дык вы, мабыць, замнога купілі, — спакойна адказала Аўрэлія.

Пасля доўгай і нудотнай выстаўкі мы кінуліся ўсёй бандай у сувенірную краму. Нам падабаліся кітайскія цацкі. Адны куплялі мыльныя бурбалкі, іншыя — безгустоўныя карцінкі. Словам — трацілі грошы на абышто, каб толькі іх пазбыцца.

У планах было яшчэ вогнішча. На жаль, на месца, дзе меў гарэць касцёр, трэба было ісці яшчэ кіламетр. Аўрэлія адмаўляла нас як умела, і мы, вядома, здаліся. У сапраўднасці ішло пра ейныя туфлі-„шпількі”; яна пабаялася, што трэба зноў дзесьці ісці. Ну, і вогнішча гарэла без нас...

У паваротнай дарозе за нас узялася зноў пані гід. Яна вымавіла вельмі важны сказ, які, я думаю, кожны з нас прыняў да сэрца.

— Сёння ў нас безнадзейная моладзь. Месяц таму ў мяне была група з далёкай Сібіры. Гэтыя людзі ўсім цікавіліся. Пабачыце вы самі! Гэта ім будзе належыць свет і будучыня!

Усе смяяліся, нават наша выхавацелька Аўрэлія. Экскурсаводка, вядома, пакрыўдзілася. Яна ўжо больш не гаварыла, адно глядзела ў акно і пра нешта думала.

У хаце ўсе кінуліся да камп’ютэраў. Мы сядзелі *на асьцы* (gadu-gadu) і пляткавалі пра экскурсіі. Найбольш пра Ігара і Паўла. Усе мазгавалі ды гадалі як склаўся іх нефармальны маршрут. Бо хлопцы, як адзіныя, маўчалі?!

тэкст:<Natasza9922wp.pl
дызайн:<lolcia05@tlen.pl>

**Галерэя „Зоркі” (Шудзялава)**

# Юстына Варановіч



Фота ГАННЫ КАНДАЦЮК

Наймалодшая з роду Варановічаў, Юстынка — класная акцёрка і дэкламатарка. Няма ў школе свята, каб яна не выступала на сцэне. У гэтым годзе Юстына заваявала першае месца ў конкурсе „Роднае слова”. Конкурс ужо другі раз ладзілі ў школе ў Бабіках. Разам з Юстынай выступалі яе сястра Паўліна і брат Павел.

У вольны час Юстына з сястрой і братам слухаюць музыку „Н.Р.М.”. Песні беларускага рок-гурту сямейка атрымала ад „Зоркі”. Зараз нашая сяброўка, разам з сямейкай жыве ў Шудзялаве і там ходзіць у школу.

З-ка

## Польска-беларуская крыжаванка № 43

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Port / Pióro | | | | | Ty | | Rów | Karta |
| | | | Głos | To | | | | |
| Sok | | Jak / Grzywka | | | | | | |
| Grzęda | | As | | Floks | Okno | Wanna | | |
| | Alfabet | | | | | | | |
| | | | | | | | Jakr | |
| | Rusałka | Dziś / Ar | | | | | | As |
| | Adres | | Konnica | | | | | |
| | | | | | Ars | | | |

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку н-р 39:** Вучоба, раб, лязо, твор, свет, святло, аладка, футра, Філіп, яно, ноч, выкрутасы. Тарыф, урок, чар, Афіны, слуп, сват, вядро, летка, мятла, яна, нос, кот, вочы.

# Гісторыя крыжамі пісаная




*Крыжы ў Вostраве; цяперашні каталіцкі крыж на другім плане*

**Спярша можа пастаўлю крыху эйнштэйнаўскае пытанне: ці вандруючы туды-сюды ў нашай прасторы, можна адначасна вандраваць і туды-сюды ў нашым часе? І адказваю: ёсць такія месцы, дзе гэта можа ўдацца...**

У агародчыку першай з боку Шушалева хаты ў Крапіўне, што за Дубровай, стаіць мураваны помнік з надпісам: „Ten pomnik postawił Stefan Adamowicz na pamiątkę wizyty biskupiej dla całej wsi 1905 r”. З другога канца Крапіўна, што ад Вострава, стаіць шмат помнікаў, каталіцкіх і праваслаўных. Надпісы на некаторых з іх банальныя, але на адным, крайнім ад Вострава, даволі цікавы. На ім, на чыгуннай табліцы на крыжы, інтэнцыя: „За упокой усопшихъ рабовъ Божихъ Антона, Ивана, Экатерины, Осипа и всехъ сродниковъ Гелажиновъ 1900го 16 сентября”. А на цокале паэтычнае апісанне: „Крестъ хранитель всея Вселенная, Крестъ красота Церкве, Крестъ царей держава, Крестъ верныхъ оутверждение, Крестъ ангеловъ слава и демоновъ адъ”. Яшчэ раней, між крыжамі і вёскай, стаіць помнік з чырвонай зоркай з інфармацыяй: „Sierżant Iwan A. Aleksiejew poległ wraz z 74 towarzyszami broni w lipcu 1944 r. Wieczna im chwała. Mieszkańcy Kropiwna”.

Між Крапіўным і Вострававам, побач павароту жвіроўкі, у кустах, прытаіўся іншы чыгунны помнік; ён з дарогі слаба бачны. На версе лацінскага крыжа таблічка з літарамі „INRI”, а на цокале надпіс: „Сей крестъ поставленъ за упокой рабовъ Божихъ Николая Анни Григоря Осипа Фами Мариі Ізидора Розаліи и всехъ сродниковъ Прашу о три раза Богородица Дево радуйся 1886 года 15 юля Ф. Иванъ Макаревицъ”. Можа тут з'явіцца здзіўленне, які гэта крыж: ці каталіцкі — з лацінскім пачаткам, ці праваслаўны — з кірылічным працягам? Разгадка гэтага не надта складаная: пасля скарэння студзеньскага паўстання 1863 г. значна ўзмацніўся русіфікацыйны ціск не толькі на землях Паўночна-Заходняга краю, але нават Прывіслінскага; гэты ціск быў збаўлены ў 1905 годзе, пра што сведчаннем згаданы на самым пачатку надпіс у Крапіўне. А вось раней трэба было падпарадкавацца царскім загадам і тэкст на цокале каталіцкага крыжа напісаць па-руску, кірыліцай.

Пацвярджэнне апошніх абставін знойдзем і ў Вострave, на заходнім канцы вёскі. Тут таксама стаіць на каменным пастаменце лацінскі крыж з чыгуннай таблічкай, на якой надпіс: „Сей Крестъ поставленъ за спасение деревни Острова Поставленъ сент. 4 д. 1886 г.” Гэта



*Каплічка з помнікам у Гарасімавічах*

таксама каталіцкі крыж. Але побач яго, у той самай агароджы стаіць і праваслаўны крыж з 1975 года, ад такіх жа гадоў каталіцкі крыж стаіць у асобнай агароджы. Відаць, тамашнія католікі адмовіліся ад свайго крыжа, зганьбаванага кірыліцай, і збоку паставілі крыж „niepokalany”. На ўсходнім канцы Вострава пры дарозе ў царкоўнае Ячна стаіць толькі праваслаўны помнік з кароткай саматужнай малітвай: „Огради Господи силою честнаго Твоего Креста Петра и Анны со чадами и сохрани ихъ отъ всякаго зла 1908 г.”

Яшчэ цікавей у Гарасімавічах, пасярэдзіне вёскі, дзе вуліцу перасякае дарога з Дубасна ў Дуброву. Побач таго скрыжавання стаіць даволі маладая, дбайна абгароджаная і дагледжаная каталіцкая каплічка. А побач яе, быццам у куточку агароджы, стаіць чыгунны помнік. На гэтым вось помніку выдатна відаць і мясцовую канфесійную гісторыю, і менталітэт нашых „тутэйшых”. Крыж звенчаны таблічкай „INRI”, але вось галоўная частка цокаля выглядае быццам *tabula rasa* — незапісаная табліца. Але калі туды дакладней прыгледзецца, дык пакажацца, што гэта будзе — калі заміж першакаталіцкай лацінскай мовы пакарыстацца пратэстанцкай англійскай мовай — *table erased* — сцёртая табліца! Бо відаць сляды шрамаў, якія не ад адліўкі чыгуну... Мабыць, адтуль быў сашліфаваны ранейшы надпіс; трэба здагадвацца, што быў ён напісаны кірыліцай. На самым пастаменце ёсць і лацінка: „Ten Krzysz postawiony za dusze w czyszczu bendoące”; даты тут няма... Тры праваслаўныя крыжы стаяць на канцы Гарасімавіч з боку Ячна; крыж з царскага часу чыгунны на каменнай аснове, без надпісаў.

На паўднёвым канцы Ячна, побач вуліцы, помнік з чырвонай зоркай на пліце і праваслаўным крыжыкам на ўквечанай жалезнай агароджы. На помніку надпіс: „St. let. Pawlinow Dmitrij Stiepanowicz poległ 26 VII 1944 r w walce z hitlerowskim okupantem o wyzwolenie wsi Jaczno. Wdzięczni mieszkańcy 26 VII 1984 r.” У баях на рубяжы мерыдыяльнай ракі Свідэркі загінула многа байцоў, але пра гэта „ўдзячныя жыхары” не згадваюць. Аднак гэты промах быў выпраўлены раней, яшчэ да баёў на Свідэрцы, бо далей ад вуліцы адзінока стаіць цэментны помнік з надпісам: „Za dusza poległych na wojnie. Fund. Stefan Ryducha 1919 r.”

У Грабянях, на ўзгорку ў цэнтры вёскі, стаяць тры помнікі: два каменныя і адзін чыгунны. Ад чыгуннага помніка захаваўся толькі цокаль; крыж быў збіты п'янымі савецкімі салдатамі, якія ў 1939-1941 гг. базіраваліся ў недалёкім Ружанастоку. З трох бакоў цокаль упрыгожаны старанна адлітымі анёлкамі, а з франтавога боку кранаючы надпіс: „Сей Крестъ поставленъ за упокой усопшихъ рабовъ Божихъ а моихъ родителей Ивана Анны и всехъ сродниковъ и техъ каторие не имеют ниоткуда спасение Прошу проходящихъ о три Богородице Дево радуйся Поставилъ Иг Самойликъ”... Якой канфесіі гэты крыж — неістотна. Істотныя тут сыноўская чуллівасць і клопат за тых, за каго няма каму клапаціцца...

На бакавым каменным помніку надпісаў няма, а каваны крыж стаіць не наверсе, толькі абаперты аб зямлю. Каваны крыж захаваўся толькі на сярэднім каменным помніку, найбольшым; відаць, руплівым чужацкім атэістам не ўдалося да яго дабрацца. На баку гэтага вялікага помніка высечаны ў камені надпіс, які ўжо цяжка чытаецца, бо і камень паддаецца засакрэчваючаму мінулае часу. Удалося мне прачытаць — не маю ўпэўненасці, ці не без памылак — наступны тэкст: „Ten Krzyż postawiony w roku 1839 dnia 20 miesiąca grudnia za dusze rodziców Filipa i Barbary Jewy i całej jego familii Proszę prosić Zdrowaś Aniołowie...” Далейшы змест сходзіць да зямелькі і не ўдалося мне яго ўстанавіць да канца; ды і паўтараю: да сапраўднасці прыведзенага тэксту не маю поўнага даверу...

Гэтая прагулка дазваляе заглянуць не толькі ў мінулае. Уцалелыя чыгунныя помнікі ўзаемна падобныя, мабыць яны з адной майстэрні; мяркую, што была яна ў недалёкім тады Гродне. Аглядаючыся вакол іх можна пабачыць і сённяшні дзень, калі паганяемыя створанай людзьмі цывілізацыяй менш азіраемся ў Неба. На цяперашніх помніках такіх малітоўных надпісаў, якія пакідалі нашы продкі — няма.

А што відаць перад намі? Тое, што і за намі. Бо не толькі калісь адыходзілі ад кірыліцы. Сёння чарговыя вернікі выбіраюць лацінку, бо наш цывілізацыйны вектар скіраваны на захад, так як калісь у гунаў, авараў ці іншых вандалаў. Наш чалавек — як бы калісь паэтычна спяваў Уладзімір Высоцкі — *толкает ногами землю на восток...*

А што набожнага відаць перад намі, на Захадзе?

**Тэкст і фота**
**Аляксандра Вярбіцкага**



*Помнікі ў Грабянях*



Ніўская сям'я цешыцца з сустрэчы



А разам з намі нашы госці: злева Лёля Міхалюк (Вялікабрытанія), Тацяна Казяк (Латвія), Аляксандр Мілінкевіч (Беларусь), Івонка Сурвіла (Канада), Хведар Нюнька (Літва)



Крышку пахмяліліся разам з Хмялеўскімі; злева: Уладзімір Лапцэвіч, Ганна Кандрацюк, Міхась Хмялеўскі і Юрка Хмялеўскі



Усе цешыліся, толькі консул Вадзім Палякоў як сапраўдны дыпламат паводзіў сябе стрымана



Мужчыны не забывалі пра настаўніц; злева: Міраслаў Пякарскі, Ніна Абрамюк, Міраслава Лукша, Яўгенія Сухадола, Анатоль Маўчун



Бадзёрасць, маладосць — усё гэта ў „Ніве”; злева: Сакрат Яновіч, Георгій Валкавыцкі, Сяргей Чыгрын





Прыгажосць і стройнасць нашай „Бацькаўшчыны”; злева: Ніна Шыдлоўская, Алена Макоўская, Барыс Сачанка і Алесь Бяляцкі

*Адным з нешматлікіх віртуальных прадстаўніцтваў ёсць сайт, прысвечаны творчасці аднаго з выдатных майстроў пэндзля са старажытнага Пінска Яўгена Шатохіна...*

# http://www.chato.info




Тое, што зямля беларуская багатая на таленавітых людзей, ні для каго не сакрэт. Цяпер у Байнэце прысутнічае шэраг сайтаў, якія тычацца дзейнасці мастакоў. Праўда, не так многа як хацелася б. Адным з такіх нешматлікіх віртуальных прадстаўніцтваў ёсць сайт, прысвечаны творчасці аднаго з выдатных майстроў пэндзля са старажытнага Пінска Яўгена Шатохіна. Каб пабачыць выявы карцін мастака і даведацца аб ім крыху больш, трэба набраць на сваім камп'ютэры адрас у Інтэрнэце **http://www.chato.info**.

Галоўная старонка сайта выглядае вельмі неардынарна. На бардовым фоне месціцца здымак двух гаршкоў на падаконніку з мноствам разнастайных пэндзляў унутры іх. Побач палітра з фарбамі, а ўверсе надпіс — Яўген Шатохін. Калі клікнуць на гэты здымак, то трапляем на першую старонку сайта, якая называецца „Біяграфія". Аформлена яна традыцыйна. Уверсе з левага боку невялікі здымак майстра, побач намаляваны нейкі будынак (пэўна, тыя, што добра ведаюць Пінск, нешта ў ім пазнаюць), з правага боку зноў жа імя і прозвішча майстра, упрыгожаныя бел-чырвона-белым сцягам.

Варта адзначыць, што змест гэтай старонкі не надта адпавядае назве. Замест „Біяграфіі" яе трэба было б назваць „Храналогія жыцця", бо тут у храналагічным парадку, як у храналагічнай табліцы ў канцы падручніка па гісторыі, пералічаны важныя моманты ў жыцці мастака. Уласна, біяграфія прадугледжвае ўсё ж такі нейкі расповед. Але і адсюль мы можам даведацца вельмі многа аб 59-гадовым пінскім мастаку. Так, у свой час ён скончыў Арлоўскі (у Расіі) педагагічны і Харкаўскі (на Украіне) мастацка-прамысловы інстытуты. З 1972 года ўдзельнічае ва ўсесаюзных, рэспубліканскіх і замежных мастацкіх выставах у жанрах акварэль, малюнак, афорт, літаграфія. Ягоныя творы знаходзяцца ў музеях і карцінных галерэях Беларусі, Расіі, Украіны, Францыі, Германіі. Сярод шматлікіх замежных узнагарод мастака — прыз Нацыянальнай асамблеі Францыі і званне ганаровага грамадзяніна французскага горада Альбэрт. Таленавіты пінчук з'яўляецца сябрам Беларускага саюза мастакоў. У 1988 годзе Яўген Шатохін заснаваў і да 1997 года ўзначальваў дзіцячую мастацкую школу ў Пінску.

Нездарма кажуць, што сапраўдны мастак павінен быць у апазіцыі да ўлады. Ён ускрывае не толькі недахопы ў яе дзейнасці, але і паказвае яе часцяком гнілое нутро. У Беларусі, пры пануючым недэмакратычным і аўтарытарным рэжыме рабіць такое і цяжка, і лёгка. Цяжка, бо гэта пагражае разнастайнымі непрыемнасцямі. Лёгка, бо ў гэтай антыбеларускай ночы лягчэй убачыць зоркі і адрозніць свет ад цемры, дабро ад зла. Па такім шляху пайшоў і Яўген Шатохін, страціўшы ў выніку палітычнага пераследу пасаду дырэктара дзіцячай мастацкай школы і патрапіўшы пад суд за палітычную дзейнасць.

Але мастак не перастае тварыць. Яго пэндзаль малюе краявіды Палесся, храмы старажытнага Пінска, пакінутыя беларускія вёскі, партрэты землякоў. З гэтымі карцінамі, а таксама здымкамі мастака з шэрагам выдатных беларускіх дзеячаў мы можам пазнаёміцца на іншых старонках сайта.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

*Футбольная зборная Беларусі нарэшце здабыла першую перамогу ў адборавым турніры да чэмпіянату Еўропы. Перад гульнёй са Славеніяй над галавой галоўнага трэнера дружыны Юрыя Пунтуса завіс Дамоклаў меч...*

# Беларусь, беларусы...

**Пробліск гульні**

Футбольная зборная Беларусі нарэшце здабыла першую перамогу ў адборавым турніры да чэмпіянату Еўропы. Перад гульнёй са Славеніяй над галавой галоўнага трэнера дружыны Юрыя Пунтуса завіс Дамоклаў меч. Параза ў Румыніі з лікам 1:3 не пакідала альтэрнатывы — вікторыя альбо „смерць". Тым больш, што перад пачаткам кваліфікацыі былі пастаўлены маларэальныя планы — 7 ачкоў з 12 у асеннім цыкле. 1 з 9 у першых трох сустрэчах наставілі ўсіх на суцэльны песімізм. Сустрэча са славенцамі ў прынцыпе для разважлівых людзей не павінна была ўспрымацца як апошні шанц. Зборная Беларусі далёка не гранд сусветнага футбола, таму ад яе трэба чакаць не фантастычных вынікаў, не першых месцаў, а найперш вартай нацыянальнай дружыны гульні. Што датычыць турнірнага месца, то разумна было б імкнуцца да сталага павышэння рэйтынгу ў кожным адборавым цыкле. Што зусім не азначае не змагацца за перамогу ў кожнай канкрэтнай гульні. Менавіта такой філасофіяй кіраваліся Латвія і Украіна, якія ўрэшце траплялі ў фінальную частку топ-турніраў. У кожным разе трэба даць Пунтусу магчымасць спакойна дапрацаваць да канца кваліфікацыйнага адбору, бо прычына нашага незайздроснага месца ў футбольнай іерархіі зусім не ў асобе трэнера, а ва ўсёй сістэме развіцця папулярнага віду спорту.

Перад спаранымі кастрычніцкімі матчамі зборная Беларусі страціла з-за траўмаў абодвух асноўных галкіпераў — Васіля Хамутоўскага і Юрыя Жаўнова. У такой сітуацыі брамніцкі пост быў давераны Уладзіміру Гаеву, якому псіхалагічна вельмі цяжка даліся паядынкі. Не прыехаў з Апенінаў на збор і форвард Віталь Кутузаў, які абразіўся на кіраўніцтва зборнай (праўда, у гэтым лакальным канфлікце намацаўся зрух да лепшага). Затое Пунтус угаварыў вярнуцца ў шэрагі дружыны шматвопытнага Сяргея Гурэнку. Матч са славенцамі стаў для рэкардсмена зборнай юбілейным — васьмідзесятым. Да слова, шасцідзесяты паядынак адгуляў іншы ветэран Аляксандр Кульчы, які з'яўляецца адным са стрыжнёвых гульцоў каманды.

А ролю выратавальніка ў паядынку са славенцамі бліскуча адгуляў форвард „Дняпра" з украінскага Днепрапятроўска, выхаванец віцебскай футбольнай школы Сяргей Карніленка, які спрычыніўся да ўсіх чатырох галоў. Пасля першага тайма нашы саступалі славенцам — 1:2. Трэба сказаць, што гэта была нейкая авантурная гульня з абодвух бакоў. Затое такая „весялосць" заўсёды падабаецца заўзятарам, бо забіваецца шмат галоў. Беларусы вызначыліся першымі (на дабіванне ў час паспеў Дзяніс Коўба), але потым двойчы прапусцілі пасля розыгрышаў гасцямі кутніх udaраў. А ў другой палове сустрэчы надышоў бенефіс Карніленкі, які двойчы забіў галавой. Толькі б не спыніўся ў сваім росце гэты фактурны і таленавіты форвард. Прыкладаў таму было ўжо нямала — Уладзімір Макоўскі, Раман Васілюк, Мікалай Рындзюк.

Кропку ў матчы паставіў Уладзімір Карыцька, які вынікова выканаў штрафны. Нашы перамаглі, выявіўшы волю і паказаўшы прабліскі класнай гульні. Але ў камандзе далёка не ўсё гладка. То Глеб малодшы патурзаецца з Карніленкам, то Міраслаў Рамашчанка „псіхане" на трэнера за раннюю замену. Так што пакуль маем толькі чатыры ачкі і пачатак стварэння каманды. Працягу будзем чакаць вясной.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# ПА ТРАДЫЦЫІ СЛЕД ПРАСТЫЎ

*Даўней вяселле на вёсцы праходзіла паводле традыцыйнага рытуалу. Кавалер пасылаў сватоў да нарачонай, затым бацькі маладых дамаўляліся наконт пасагу. А вяселле гулялі тры дні. У суботу каравайніцы пяклі каравай. У той жа вечар маладыя са сваім дружбантам прыходзіў да дзяўчыны за кашуляй. Быў пачастунак для гасцей. У нядзелю рыхтавалі маладых да шлюбу. Маладая склікала сваякоў і сяброў, маладыя — таксама. Пасля кароткага пачастунку госці кідалі маладым на талерку грошы „на спамаганне". Ад'язджаючых у царкву блаславіў бацька. Перад першай фурманкай клалі бохан хлеба, завернуты ў вышываны ручнік. Бацька тройчы абыходзіў фурманку і крапіў яе свянцонай вадою. Вясельную світу праводзілі музыканты, затым усе ехалі да шлюбу.*

*Пасля вянчання карагод фурманак, упрыгожаны каляровымі стужкамі, падаваўся да фатографа зрабіць маладым памятны здымак. Адтуль ехалі да маладой. Бацькі дзяўчыны віталі іх хлебам і соллю.*

*Вяселле адбывалася ў хаце маладых або ў мясцовым клубе. Пасля поўначы маладой здымалі вэлюм. З таго часу лічылася яна замужняй жанчынай.*

*У панядзелак госці маладой ехалі да маладога з „прыданнем". На першай фурманцы ставілі куфар з рэчамі ды везлі курачку. У гэты час у хаце кавалера за першым сталом засядалі „перабранцы". Старшы дружбант вымушаны быў выкупіць у іх месца. Дружкі таргаваліся. У канцы атрымоўвалі пакет цукеркаў і ўступалі месца шлюбнай пары. У час пачастунку дзялілі каравай, а маладая абдароўвала бацькоў ды сям'ю мужа падарункамі. У бліжэйшы чацвер у дзяўчыны арганізавалі „перажвы", а ў хлопца — у суботу. На гэтым канчалася вясельная імпрэза.*

*Па даўнейшай традыцыі след прастыў. Зараз да шлюбу едуць на аўтамабілях і аўтобусах. Вяселле арганізуюць у адмысловых залах або рэстаранах. Вясковых музыкантаў заступае аркестр. Уся імпрэза запісваецца на відэакасеты.*

*Нядаўна праязджаў я на роварах праз Рэпчычы і ўбачыў шлюбную пару, якая рабіла здымкі над вадасховішчам. Зараз тут такая звычка. Папрасіў я пару на кароценькую размову і памятны здымак для „Нівы".*

*— Адкуль будзеце? — пытаю дзяўчыну ў велюме.*

*— Я Барбара Янашук, выходжу з Тымянкі, — заяўляе маладая.*

*— А я з Такароў, — гаворыць ейны муж. — Маё прозвішча Раман Паўлючук. Працую ў агародніцкай гаспадарцы „Барбара". Жонка пакуль застанецца на маім утрыманні. Вяселле адбываецца ў карчме „У Валентага" ў Кляшчэлях. Вырашылі мы запісацца на відэакасету ў пленэры над вадасховішчам.*

*Даўней такое было б немагчымым. Зараз гэта звычайная справа. Вось што значыць прагрэс.*



Барбара Янашук і Раман Паўлючук над Рэпчыцкім вадасховішчам

**Тэкст і фота (ус)**

# Пад юбілей Орлі



**Орлі пяцьсот гадоў. Найранейшай архіўнай згадкай пра гэтую мясцовасць з'яўляецца інфармацыя з 1507 года пра прысваенне каралём ваяводу троцкаму Яську Івановічу надзелу зямлі, на якой сёння распаложана Орля. Орля (на 74 гады старэйшая за Беласток) — гэта колішні горад на магнацкіх землях, які гарадскія правы захоўваў на працягу амаль трохсот гадоў — з 1634 года да канца XIX стагоддзя. Назва мясцовасці выводзіцца ад ракі, якую ў XVI ст. называлі Орляй — ад арлоў, а цяпер Арлянкай.**

З 1510 года Орля была ўласнасцю казначэя Вялікага княства Літоўскага Багдана Багавіціновіча — ён быў фундатарам першай арлянскай царквы. У 1540 годзе Орля шляхам сямейных парадненняў перайшла ва ўладанне магутнага малапольскага роду Тэнчынскіх герба Тапор (ад гэтага і выява тапара ў гербе мясцовасці), а пазней — такім жа самым шляхам — Алелькавічаў (1559), Радзівілаў (1585), Браніцкіх (палова XVIII ст.) і Вітгенштэйнаў (XIX ст.).

Асаблівую ролю ў развіцці Орлі адыгралі Радзівілы. Рост эканамічнага значэння Орлі прычыніўся да ўзвядзення тут імі абарончага замка ў 1622 годзе (быў ён знішчаны ў час шведскіх войнаў); стаяў ён паблізу сённяшняй вуліцы Бельскай. Таксама Радзівілы збудавалі дворскі ансамбль з палацам, фальваркам, пейзажным паркам і сакральнымі аб'ектамі. У пачатку XVII ст. Орля мела таксама свой карабель, прычалены на Бугу ў Мельніку, якім арляне адпраўлялі збожжа ў далёкія парты. Дзякуючы хадайніцтвам Радзівілаў Орля ў 1634 годзе атрымала магдэбургскае гарадское права і дазвол пабудаваць ратушу, атрымала таксама герб у выглядзе чорнага арла на чырвоным полі з мітрай на галаве і з тапаром у правай назе.

Шведскія войны 1655-1657 гг. прынеслі гораду Орлі значныя страты, а шматлікія кальвініскія вернікі, што трымаліся Радзівілаў, загінулі ў час баёў. Будынак, у якім быў іх збор, у пачатку наступнага стагоддзя адкупілі яўрэі з прызначэннем на сінагогу; апошнія былі рухавіком развіцця Орлі.

У 1874 годзе апошні ўласнік Орлі, князь Вітгенштэйн, які ажаніўся з княжнай Радзівілянкай, прадаў зямлю жыхарам Орлі. У канцы XIX ст. Орля страціла гарадскія правы.

Праваслаўны прыход у Орлі існуе ад XVI стагоддзя. З самога пачатку былі тут дзве царквы: Іаана Багаслова і Сімяона Стоўпніка. Цяперашняя царква Арханёла Міхаіла з'яўляецца наследніцай храма Сімяона Стоўпніка, які згарэў у 1790 годзе.

* * *

Будучы ўраджэнцам Орлі я здаўна адлюстроўваю на здымках жыццё маёй мясцовасці і яе наваколля. Таксама на старонках розных часопісаў і кніжак змяшчаю ўспаміны жыхароў гэтай зямлі. Я свядомы, што дакументую мімалётную сучаснасць, якая зараз становіцца гісторыяй.

Дзякуючы ўласнай настойлівасці і карпатлівай працы, для ўвекавечання юбілею 500-годдзя Орлі, дзеля ўшанавання і прамоцыі маёй Малой айчыны, я на ўласны кошт выдаў першыя чатыры аўтарскія (здымкі і праекты) каляровыя паштоўкі, у тым ліку і рарытэтную зімовую калядную. На гэтых паштоўках я запрапанаваў наступныя тэмы:

— Міхайлаўская царква са званіцай канца XVIII ст., неацэнны помнік матэрыяльнай і духовай культуры;

— капліца св.св. Кірылы і Мяфодзія з 1870 г.;

— капліца Сімяона Стоўпніка з 1995 г.;

— сінагога з другой паловы XVIII ст. (паліхромія);

— комплекс школ у Орлі;

— дворскі парк з XVIII ст.;

— адпачынкавы парк;

— плаціна на рацэ Арлянцы.

Дагэтуль Орля не мела прафесіянальнай паштоўкі. У будучыні хачу запрапанаваць чарговыя іх версіі. Варта іх мець у сваёй калекцыі ці пасланць блізкім або знаёмым у свет. Кожны зацікаўлены жыхар Орлі і наваколля можа іх атрымаць дарам.

Аказваецца, што арляне з мілай нечаканасцю і вялікай радасцю ўспрынялі прыгожыя паштоўкі. Яны ганарацца такой прыгожай Арлянскай зямлёй, адчуваюць гонар і чуллівасць ды адразу выяўляюць, што пашлюць іх знаёмым і блізкім, найчасцей у Амерыку, Маскву, Галандыю, Бельгію, Ісландыю, Грэцыю... Бо такі час, што многія арляне расселіся па свеце.

**Міхал МІНЦЭВІЧ**

# Агароднік з Маліннік

**Сцяпан Калішук з Маліннік — вядомы ў наваколлі агароднік. Даўней прывозіў ён на рынак у Чаромху агародніну, зараз — адно кветкі. Аднойчы сказаў мне: „Прыедзь у Малінніках. Дыні пабачыш, зробіш здымкі, ды ў „Ніву" напішаш. Незвычайныя гэтыя дыні, аграмадныя. Двух мужыкоў спатрэбіцца, каб па дошцы ўкаціць іх на фурманку".**

Карыстаючыся нагодай, а было гэта 1 кастрычніка, наведаў я сябру. Тое, што я пабачыў, дык у галаве не змяшчалася. На сядзібе Сцяпанавага сына, непадалёк колішняй школы, знаходзіцца агарод. А на ім — дыні-веліканы. Шмат іх там. Не ведаю колькі адна можа важыць, але з месца мужыку варухнуць яе немагчыма. А побач залягаюць дыні звычайных памераў, якія растуць у нашых агародах. У параўнанні з волатамі, якія выраслі ў Калішука, яны выглядаюць звычайнай гарошынай.

— Насенне я выпісаў з адной фірмы, — патлумачыў мне агароднік. — Паводле каталога, адна дыня можа важыць кілаграмаў чатырыста. Сёлета сонца іх засушыла, а то яшчэ выраслі б большыя.

Але не адно дынямі захапляўся я ў Калішуковым агародзе. Непадалёк дыняў, на другім участку, растуць надта высокія сланечнікі, проста з небам гавораць. Калі я рабіў Сцяпанавым унукам здымкі, яны мне здаліся мурашкамі на фоне сланечнікаў. Калега сказаў мне на развітанне, што рашыў дыню-велікана прывезці ў Чаромху і паказаць людзям, а вясною яе насенне будзе прадаваць на рынку. Калі паверыць словам малінніцкага агародніка, дыні гэтыя надта смачныя. Аж хочацца паспрабаваць!

**Уладзімір СІДАРУК**



фота Уладзіміра СІДАРУКА

*Сцяпан Калішук з унучкай і дынямі*

**Ніва**
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.

**Камп'ютэрны набор і карэктура:** Яўгенія Палоцкая.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2007 r. upływa 5 grudnia 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji.

Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
**Nakład**: 1500 egz.

Суседскія былі

# Беларускі бегемот



**Першыя два-тры дні даследчай экспедыцыі, звязанай з вывучэннем мінуўшчыны беларускай правінцыі, звычайна не абыходзяцца без праверкі асаблівасцяў смаку і псіхалагічных уздзеянняў мясцовай самагонкі на мазгі і светапогляд людзей, якія прэтэндуюць на званне навуковай эліты нацыі. Чарговая экспедыцыя, арганізаваная ў канцы васьмідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя Міністэрствам культуры БССР, ад самага пачатку не збіралася парушаць даўнішніх традыцый беларускіх навукоўцаў. Таму, калі на трэці дзень цяжкіх навуковых даследаванняў і смелых эксперыментаў Віктар Самчук абудзіўся ў намёце ад невыноснага галаўнога болю, то гэты факт ён расцаніў з традыцыйным для навукоўцаў філасофскім падыходам, прыняўшы яго як пабочныя, але неабходныя ўздзеянні сваёй прафесіі на неакрэплы малады арганізм.**

Фізічны стан Валодзі Касілы, яшчэ адной жывой істоты ў гэтым намёце, ні кроплі не адрозніваўся ад Віктаравага, з той толькі розніцай, што Касіла яшчэ спаў і з тае прычыны не ведаў, што яго галава таксама развальваецца ад болю на дзве сіметрычныя часткі.

— Спіць як пшаніцу прадаўшы, — нечакана для сябе самога зноў набыў здольнасць разважаць Віктар, хоць кожная заляцеўшая ў галаву думка патройвала і без таго звышбязлітасны боль. — Пайду да ракі. Скокну ў ваду. Можа ад гэтага палягчэе.

Ён выпаўз на чатырох канечнасцях на Божы свет і стаў прыпамінаць учарашнія прыгоды. Вясёлы жартаўлівы дзядок, у якога носьбіты навукі куплялі самагонку, папярэджваў, што тая зараза вельмі моцная. Градусаў так пад сто сем — сто дзесяць. Як нальеш у шклянку, то адразу трэба піць. А то сама загарыцца ад доўгага сутыкнення з паветрам. Вечарам з таго жарту было вельмі смешна. А з ранку... „Лепш бы яна сапраўды згарэла ўчора!" — падумаў Віктар і пастараўся стаць па-чалавечы. На дзве нагі.

Праз некалькі хвілін вузенькая сцяжынка прывяла навукоўца з пераконаным, як у дэбіла, тварам, да берага невялічкай рачулкі. Самчук асцярожна, каб не паваліцца, прысеў да вады. І тут, валасы яго падняліся дыбам, як у самцоў шакалаў, якія б'юцца паміж сабой у перыяд спарвання. Вочы прынялі форму дакладна правільных кругоў, павылічыліся ў тры разы і мала не выкаціліся з чэрапа, які ад убачанага імгненна перастаў балець. Пасярод ракі, трошкі не звяртаючы ўвагі на вышэйшае стварэнне эвалюцыі, стаяў бегемот.

Вышэйшае ж стварэнне гопнулася мяккай часткай свайго цела на зямлю і ліхаманкава пачало рабіць спробы асэнсаваць сітуацыю. „Так! Я бачу бегемота! Але ж гэта немагчыма! — стаў панічна разважаць Самчук. — Бегемота ўбачыць не так проста. Гэта выміраючая жывёла. І жыве яна ў Афрыцы. А я ў Мінскай вобласці, самым цэнтры Беларусі! Скуль тут могуць узяцца бегемоты! Значыць, гэта не бегемот! Гэта здань, прывід, глюк ад перапітага!"

Віктар пастараўся разагнаць здань. Ён перахрысціўся, памахаў рукой у паветры, але бегемот не прапаў. Няшчасны навуковец пачаў плакаць: „Божа мой! Я ж яшчэ малады, а мне ўжо прывіды ад гарэлкі мрояцца. Я хіба алкаголік! Гэта ж не лечыцца. Трэба скарэй ісці спаць, пакуль у раку чэрці не прыйшлі купацца. Галоўнае, каб ніхто не даведаўся, а то з работы папруць".

Ён ціхенька вярнуўся ў намёт і накрыўся з галавой. Але разбудзіў пры гэтым Валодзю, які адразу ж, як пралупіў вочы, даведаўся, што ў яго цэлую ноч балела галава. Касіла на каленях пачаў выпаўзаць з намёта.

— Мазгавешка трашчыць. Пайду да ракі, памыюся, — паведаміў ён свайму калегу.

— Ага, — дрыжачым голасам адказаў той і яшчэ мацней заплакаў у коўдру, шкадуючы свой малады, загублены алкаголем лёс. Але праз некалькі хвілін плач прыйшлося перарваць.

— Бегемот! — закрычаў прыляцеўшы з ракі Касіла. — У рацэ купаецца бегемот!

— А такія рагатыя з хвастамі і капытамі там не купаюцца? — збіў яго імпэт Самчук. — Ты чаго равеш? Зараз дырэктара рзабудзіш. Вось яму будзе цікава даведацца, што ты ўжо настолькі сеў на шклянку, што пасярод Беларусі бегемотаў стаў заўважаць.

— Ідры маю панчоху, — збялеў Касіла. — І праўда! Скуль жа тут возьмецца бегемот? Гэта што, мне прыглючылася? О, Божа! Я ж яшчэ малады! Што рабіць?

— Рабі што і я, — параіў Віктар. — Я як бегемота ўбачыў, адразу вырашыў — трэба праспацца.

— Пачакай, — зморшчыў лоб Валодзя. — Значыць, ты таксама бегемота бачыў. Але ж ці можа такое быць, каб адзін і той жа прывід бачыўся розным людзям?

— А гарэлку мы аднолькавую пілі, — з навуковым падыходам разбіў аргументы Уладзіміра Віктар. — Вось і мроіцца тое самае.

Касіла на хвілінку задумаўся, а пасля ў знак згоды кіўнуў галавой і накрыўся коўдрай. Абодва навукоўцы глыбока і цяжка ўздыхнулі. Збіраліся заснуць, але ў намёт уварваўся дырэктар экспедыцыі.

— Эх, алканаўты, спіце! — закрычаў ён. — Так усё цікавае праспіце. Ідзіце лепш да ракі. Там бегемот.

— Бегемот?! — у адзін голас зараўлі хлопцы. — Адкуль на Беларусі бегемоты?!

— Як адкуль? — дырэктар спалохана адсунуўся ад сваіх падначаленых. — Я ж вам яшчэ ўчора казаў, ды вы так набраліся гарэлкі, як свіння бруду, што хіба не чулі. Чэшскі цырк начаваў на тым беразе ракі. У іх там бегемот ёсць. Зараз яго цыркачы на раку мыць прывялі. А вы чаго такія напалоханыя? Што здарылася? Няўжо бегемотаў баіцеся? Не бойцеся. Той бегемот прыручаны і цалкам бяспечны.

**Віктар САЗОНАЎ**




# Адгаданка

1. расліна сямейства дзеразовых, 2. два плюс тры, 3. напр. Этна, 4. музычны твор з некалькіх рознахарактарных п'ес аб'яднаных адзінствам задумы, 5. між Мінскам і Кішынёвам, 6. свята ў пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня, 7. дзіцяня зубра, 8. невялікі свінцовы снарад у патроне для стральбы з ручной агнястрэльнай зброі, 9. пераноснае конусападобнае жыллё качэўнікаў крытае скурамі, 10. мяккая частка цела жывёлы або чалавека, 11. прымацаваная да сцяны гарызантальная дошка для розных прадметаў, 12. напр. масляк, 13. муж дачкі, 14. паласаты пушны звер сямейства куніцавых, 15. 3,1415...

**(Ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Ясона Евангелу.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 37 нумара**

Ліхвяр, Манблан, анаконда, юань, ціскі, гіпс, Анега, Мазыр, трон, Арлоў, змазка, Клімент, грызун, вагон.

Рашэнне: **Вярблюд носіць на спіне гарызонт разам з узгоркамі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

# 22.10 – 28.10

**Баран (21.03. — 19.04.)** Будзеш такі чароўны, што ніхто перад табою не ўстаіць! Добра ідуць справы ў літаратараў, працаўнікоў радыё, рэкламы ды палітыкаў. Вялікія тэмперамент і скандальнасць.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Не з кожнай асобай табе па дарозе. Не перабольшвай значэння партнёраў у сваіх справах, толькі раскручвай сваю ініцыятыву, праяўляй творчасць. 26.10. магчымы прыбытак. Пара больш паклапаціцца аб свой выгляд — масаж твару ці касметолаг адымуць табе пару гадоў.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Не ідзі ў зваду з тымі, хто ад цябе стаіць вышэй. Да 24.10. добра ідуць размовы і здаюцца экзамены. Спрэчкі з канкурэнтамі ці праціўнікамі. Захапляешся незвычайнымі асобамі — хоць бы прычоска павінна быць у іх арыгінальнай. Не сядзі задоўга ў душным памяшканні.

**Рак (22.06. — 22.07.)** 24-26.10. клопаты са здароўем, стрэсы. 23-27.10. сваркі з партнёрам, асабліва за грошы. Не плавай у басейне, хутчэй ідзі на трэнажоры. Не застудзіся.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Да 25.10. разлічвай выключна на сваю інтуіцыю, не апірайся на парады сяброў ці блізкіх. 26.10. прыбытак у кішэні. Сур'ёзныя любоўныя адносіны. Абмяжуй салонае, салодкае ды спіртное (прыняў яго адно для націранняў!).

**Дзева (23.08. — 22.09.)** 22-25.10 старайся больш адпачываць і ўслухайся ў тое, што падказвае табе сэрца. Не крытыкуй іншых. Знакаміта працуе твой інтэлект.

**Шалі (23.09. — 22.10.)** 23-27.10. будзеш поўны красы, вабнасці ды бавітасці. Добры час і на інтарэсы. За свае каштоўнасці змагайся, нават вострa.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** 24.10. перад табой ніхто не ўстаіць на нагах; паўнютка аматараў. Дыхаеш рамантыкай і таемнасцю. Ты дасканалы як кіраўнік, так і выканаўца. Зрабі сабе ў хаце куточак для рэляксацыі ды для інтыму.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** 22.10. маеш шанц пазнаёміцца з далікатнымі, інтэлігентнымі, дасціпнымі і сціплымі людзьмі. Добры час вучыцца, пашыраць свае кругагляды, на пачатак навук. 23-27.10. прадбачваюцца няўдалыя замежныя падарожжы, праблемы з экзаменамі і законам (не пачынай судовых спраў!).

**Казярог (22.12. — 19.01)** Могуць пахаладзець твае адносіны з сябрамі. Размаўляючы, узважвай кожнае слова. 23-27.10. прыкмеціш вакол сябе больш маны, крывадушнасці; можаш канфліктаваць з атачэннем.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** З 26.10. рэалізацыю ўласных амбіцый выдатна спалучыш з павелічэннем маёмасці. Можаш выплысці на шырокія воды — імпульс збоку ды інфармацыйная падтрымка. Можаш стаць лідэрам.

**Рыбы (19.02. — 20.03.)** Кар'ера рушыла з мёртвага пункта, але перашкодай могуць стаць закон, несумленнасць, недахоп дысцыпліны, бюракратычныя бар'еры. Твая расхлябанасць будзе карацца на кожным кроку! Асцерагайся таксама несправядлівай ацэнкі твае дзейнасці! Пагражае табе нават псіхічная траўма; абыходзь вострыя вуглы!

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960